Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
17 ВЕРАСНЯ 2022 г. СУБОТА № 183 (29805)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# АГУЛЬНАЯ БУДУЧЫНЯ Ў МІРЫ І ЗГОДЗЕ

***Дарагія суайчыннікі!***

***Віншую вас з Днём народнага адзінства.***

***На сваім тысячагадовым шляху да самавызначэння беларускі народ дастойна пераадолеў шматразовыя спробы пазбавіць яго гістарычнай перспектывы, культурнай і духоўнай самабытнасці.***

***Дата 17 верасня 1939 года — сімвал гістарычнага афармлення беларускай нацыі і шчырага імкнення беларусаў, падзеленых паняволі, жыць адной сям'ёй ва ўласным доме.***

***Набыўшы цэласнае і непаўторнае аблічча ўтульнай і гасціннай краіны ў цэнтры Еўропы, уз'яднаная Беларусь стала месцам сілы для мільёнаў грамадзян, якія з гонарам выстаялі ў складаных перыпетыях XX стагоддзя і сёння стаяць на варце суверэнітэту і незалежнасці роднай зямлі.***

***Дзень народнага адзінства — падзяка сучаснікаў папярэднім пакаленням, якія абаранілі права самім вызначаць свой лёс. Ён узмацняе гонар за краіну і дае ўсведамленне таго, што беларусы — адзіны народ. У гэтым заключаюцца асновы стабільнасці і дабрабыту сучаснай беларускай дзяржавы.***

***Аб'яднаныя марай аб паспяховай і квітнеючай Беларусі, здабываючы ўрокі з нашай гісторыі, мы ў міры і згодзе стваральнай працай будуем агульную будучыню.***

***Умацоўваючы беларускую дзяржаўнасць, разам працягваем свой шлях да новых вяршыняў і яркіх перамог, якімі будуць ганарыцца нашы нашчадкі.***

***Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.***

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

З першых вуснаў

# «МЫ ГАТОВЫ АКТЫЎНА ПАДКЛЮЧЫЦЦА ДА СУМЕСНАЙ РАБОТЫ»

**ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА Ў ВЫСТУПЛЕННІ НА САМІЦЕ ШАС ЗАЯВІЎ АБ ПРЫЯРЫТЭТАХ КРАІНЫ Ў ГЭТАЙ МІЖНАРОДНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ**



Фота БелТА.

**На пачатку свайго выступлення беларускі лідар падзякаваў удзельнікам саміту за аднагалосную падтрымку ў пытанні атрымання Беларуссю статусу паўнапраўнага члена арганізацыі. Прэзідэнт таксама выказаў упэўненасць, што «шанхайскі дух» і ўсебаковае супрацоўніцтва здольныя стаць моцным падмуркам для новай архітэктуры свету.**

«Прыярытэты Беларусі ў ШАС нязменныя — гэта эфектыўнае супрацоўніцтва з партнёрамі па ўмацаванні рэгіянальнай бяспекі, інтэнсіўным развіцці эканамічнага ўзаемадзеяння, паглыбленні гуманітарных сувязяў», — заявіў беларускі лідар.

Асобна Аляксандр Лукашэнка вылучыў шэраг напрамкаў супрацоўніцтва.

## Аб новых выкліках у эканоміцы

На парадку дня — каардынацыя сумесных дзеянняў і выпрацоўка калектыўнага адказу на новыя выклікі і пагрозы ў эканоміцы. «Мы выступаем за развіццё ўзаемазвязанасці, стварэнне камбінаваных зялёных калідораў і далейшае ўкараненне сістэмы інтэграванага кіравання транспартнымі патокамі з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт выказаў перакананне, што надыходзіць спрыяльны час для лагістычных і інфраструктурных праектаў, якія ўжо стартавалі і звязваюць Еўропу з Азіяй, уключаючы рэалізацыю ініцыятывы «Новы Еўразійскі сухапутны мост».

## Аб развіцці гандлю

За 20-гадовую гісторыю арганізацыяй шмат зроблена па стварэнні спрыяльных умоў для развіцця гандлю і інвестыцый. «Беларусь бачыць вялікі патэнцыял ШАС у плане стымулявання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, найбольш запатрабаваныя напрамкі такога супрацоўніцтва — гэта прамысловая і тэхналагічная каапрацыя; лічбавая трансфармацыя і штучны інтэлект; зялёная эканоміка і кліматычная адаптацыя; зняцце неабгрунтаваных гандлёвых бар'ераў.

«Гэта дасць магчымасць забяспечыць спалучэнне нацыянальных стратэгій і доўгатэрміновых планаў стабільнага і паскоранага развіцця», — заявіў Прэзідэнт.

«Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні супрацоўніцтва ў сферы мірнага атама, а таксама ў галіне прымянення розных эканамічна эфектыўных і экалагічна чыстых тэхналогій», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## Аб банкаўскай і фінансавай сферах

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння трэба па-новаму паглядзець на стан супрацоўніцтва ў банкаўскай і фінансавай сферах.

СТАР. 2

## КОРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўчай прамысловасці з Днём работнікаў лесу, які адзначаецца 18 верасня.

• Новым гендырэктарам РУП «Белмедпрэпараты» стала Вольга Якубіцкая.

• «Белавія» скароціць час палёту ў Хургаду і Шарм-эль-Шэйх.

# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

**Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца**

**Невыпадкова новы праект — «Вогненныя вёскі. Нельга забыць (Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца)» мы распачынаем у Дзень народнага адзінства. Памяць — менавіта тое, што нябачнай, але вельмі моцнай сувяззю яднае, мацуе наш народ. Памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны — святая для кожнага беларуса.**

**Спаленыя нацыстамі ў гады акупацыі населеныя пункты — наша агульная незагойная рана. Яна дагэтуль баліць, крываточыць. Выжыць у вогнішчы смерці, распаленым гітлераўцамі і іх памагатымі, удалося нямногім. Аднак выжылі. Для таго, каб расказаць нам, сучасным пакаленням беларусаў, што вайна — гэта трагедыя, што фашысты — забойцы, што гэты жах БОЛЬШ НІКОЛІ не павінен паўтарыцца.**

**Больш за 9300 вёсак і пасёлкаў (менавіта такую лічбу цяпер даюць даследчыкі) поўнасцю і часткова было сцёрта з геаграфічнай карты Беларусі. Большасць населеных пунктаў было спалена з людзьмі. Колькі з іх — назаўсёды, — не падлічана да гэтага часу (у мемарыяльным комплексе «Хатынь» увекавечана 186 вёсак, якія так і не адрадзіліся). У полымі загінулі цэлыя сем'і, дзеці, у тым ліку яшчэ ненароджаныя...**

**Мы не забыліся, колькі гора беларускаму народу прынеслі акупанты. Аб гэтым сведчаць тысячы помнікаў спаленым вёскам па ўсёй Беларусі. Дагледжаныя, са свежымі кветкамі — да іх ніколі не зарасце народная сцяжынка. На старонках «Звязды» — унікальныя факты, успаміны сведкаў тых жудасных падзей, некаторыя з якіх публікуюцца ўпершыню. Наступныя пакаленні павінны ведаць, якой цаной беларускаму народу дасталася Перамога.**

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!
Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «МЫ ГАТОВЫ АКТЫЎНА ПАДКЛЮЧЫЦЦА ДА СУМЕСНАЙ РАБОТЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Незаконныя санкцыі, адключэнне ад міжнародных разлікаў, іншыя нелегітымныя абмежаванні вядуць да неабходнасці збліжэння плацежных сістэм, павелічэння долі нацыянальных валют у гандлі, а таксама стварэння ўласных фінансавых механізмаў у рамках ШАС. Гэты падыход дасць не толькі свабоду выбару, але і свабоду дзеяння», — заявіў кіраўнік дзяржавы.



Фота БелТА.

### Аб харчовай бяспецы

Беларусь традыцыйна моцная ў пытаннях харчовай бяспекі. Па шэрагу напрамкаў сферы АПК беларускімі аграрыямі дасягнуты вынікі сусветнага ўзроўню, а якасць айчыннай прадукцыі вядома ва ўсіх краінах арганізацыі і не толькі. «Мы гатовы актыўна падключыцца да сумеснай работы па забеспячэнні харчовай бяспекі нашай сям'і, «сям'і ШАС», уключаючы супрацоўніцтва ў сферах разумнай сельскай гаспадаркі, аграінавацый, тэхналогій дакладнага земляробства і рэсурсазберагальных тэхналогій», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

### Аб пашырэнні міжнароднага ўзаемадзеяння

Мінск таксама выступае за пашырэнне міжнароднага ўзаемадзеяння і развіццё супрацоўніцтва ШАС з іншымі рэгіянальнымі структурамі, такімі як АДКБ, СНД, ЕАЭС.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў канчатковым выніку гэта можа стварыць падмурак для далейшага ўмацавання еўразійскага партнёрства на аснове канцэпцыі «інтэграцыя інтэграцый».

### Аб гуманітарным вымярэнні

Беларусь надае важнае значэнне гуманітарнаму вымярэнню ШАС. Асаблівае месца займае ўзаемадзеянне па развіцці традыцыйнай і інавацыйнай медыцыны, у тым ліку тэлемедыцыны, вытворчасці лекавых сродкаў і медыцынскіх вырабаў, аб чым на саміце гаварыў і прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі.

Асобна Аляксандр Лукашэнка сказаў пра спорт: «Прэзідэнт Расіі вельмі выразна абазначыў гэту тэму. Спорт прызначаны аб'ядноўваць краіны і народы. Цяпер, на жаль, ён таксама масіравана палітызуецца Захадам».

У мэтах павышэння аўтарытэту дзяржаў-членаў і канкурэнтаздольнасці спартсменаў на сусветных арэнах беларускі бок прапануе разгледзець магчымасці правядзення ў рамках ШАС комплексных міжнародных спаборніцтваў па летніх алімпійскіх відах спорту ў 2024 годзе і па зімовых — у 2026 годзе.

### Аб сферы бяспекі

Беларусь гатова канструктыўна супрацоўнічаць па пытаннях процідзеяння тэрарызму, сепаратызму, экстрэмізму, незаконнаму абароту наркотыкаў, зброі, ядзерных і радыеактыўных матэрыялаў, арганізаванай злачыннасці і нелегальнай міграцыі, заявіў Прэзідэнт.

«Я абсалютна падтрымліваю выказанае тут Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам меркаванне аб процідзеянні ўмяшанню пэўных краін ва ўнутраныя справы дзяржаў і процідзеянню каляровым рэвалюцыям», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама заявіў аб падтрымцы стварэння Універсальнага цэнтра па пагрозах і выкліках бяспецы ШАС на базе Рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры ў Ташкенце.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўзаемадзеянне і збліжэнне Беларусі з ШАС непарыўна звязана з фарміраваннем архітэктуры бяспекі і супрацоўніцтва ўсяго еўразійскага кантынента. «Дзякуючы свайму палітычнаму ўплыву, эканамічнай сіле і ўнутранай трываласці наша арганізацыя цалкам саспела для таго, каб больш актыўна і настойліва садзейнічаць выбудоўванню міжнароднай палітыкі на прынцыпах непадзельнай бяспекі і разнастайнасці шляхоў прагрэсіўнага развіцця», — сказаў ён.

**Паводле БелТА.**

# «ТРЭБА ТРЫМАЦЦА РАЗАМ, КАБ НЕ ПРОСТА ВЫЖЫЦЬ, А ЗАНЯЦЬ СВАЁ МЕСЦА ПАД СОНЦАМ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Самаркандзе напярэдадні пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС правёў двухбаковую сустрэчу з Прэзідэнтам Ірана Эбрахімам Раісі, паведамляе БелТА.**

«Трэба трымацца разам, каб не проста выжыць, а заняць сваё месца пад сонцам», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён адзначыў, што фармат сустрэчы на палях саміту не дазваляе вельмі паглыбіцца ў пытанні развіцця адносін паміж Беларуссю і Іранам. Але гэта магчымасць аб чым-небудзь папярэдне дамовіцца — сустрэчах, парадку дня, пагаварыць аб нейкіх сур'ёзных пытаннях. «Гэта вельмі важна. І ў гэтым ёсць магчымасць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка абазначыў два вектары для міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Ірана: інтэнсіфікаваць адносіны і правесці іх рэвізію.

Паводле яго слоў, у бакоў ужо склаліся нядрэнныя адносіны, але іх трэба інтэнсіфікаваць: «Вызначыць тыя напрамкі, па якіх мы будзем выбудоўваць адносіны ў перспектыве паміж Іранам і Беларуссю. А для гэтага нашы спецыялісты, міністры, міністэрствы замежных спраў павінны правесці рэвізію тых пытанняў, па якіх мы спрабавалі некалі дамовіцца, па якіх мы працуем. Адкінуць тое, што ўжо ўстарэла. І пакінуць пытанні перспектыўнага характару, па якіх мы будзем рухаць нашы адносіны».

У 2021 годзе тавараабарот Беларусі з Іранам склаў $33,3 млн (134,7 працэнта да ўзроўню 2020 года), экспарт — 14 млн (110,5 працэнта), імпарт — $19,3 млн (160,3 працэнта). У студзені—ліпені 2022 года тавараабарот вырас да $40,1 млн (219 працэнтаў да паказчыка аналагічнага перыяду 2021 года), экспарт — $28,3 млн (306,1 працэнта), імпарт — $11,8 млн (130,2 працэнта).

Сацыяльная адказнасць

# БЕСПРАЦОЎНЫЯ БЫВАЮЦЬ РОЗНЫЯ

## На Міншчыне вызначаць катэгорыі незанятых у эканоміцы

**Першым гэта зрабіў Чэрвеньскі раён. Менавіта таму тут адбылася выязная нарада аблвыканкама па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта № 3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» з удзелам кіраўніка рэгіёна Аляксандра ТУРЧЫНА.**

На пачатак верасня ў Мінскай вобласці было амаль 15,5 тысячы вакансій. Гэта трохі менш, чым летась. Амаль не змянілася і колькасць тых, хто звярнуўся ў органы занятасці, больш за 11 тысяч з іх сёлета працаўладкаваліся. Колькасць беспрацоўных у вобласці зменшылася больш чым на тысячу чалавек (узровень беспрацоўя 0,1 працэнта). На ўліку ў службе занятасці цяпер зарэгістравана каля 700 чалавек.

У Мінскай вобласці 23 камісіі вырашаюць праблемы занятасці насельніцтва. За паўгода яны заслухалі 26,5 тысячы грамадзян. З іх амаль тры тысячы вядуць асацыяльны лад жыцця.

На Чэрвеньшчыне прадстаўнікі службы занятасці, райвыканкама, іншых зацікаўленых падраздзяленняў абышлі ўсіх грамадзян раёна, што лічацца ў базе незанятых у эканоміцы, і зрабілі яе больш дакладнай.

— На прыкладзе Чэрвеньскага раёна я хацеў бы паказаць работу, якая вядзецца ў гэтай сферы, — сказаў Аляксандр Турчын. — Наша задача — максімальна персаніфікаваць катэгорыю незанятых у эканоміцы. Мы павінны разумець, як працаваць з кожнай, дзе варта больш увагі ўдзяліць падатковай службе, дзе патрабуецца дапамога органаў унутраных спраў, сельсавета, устаноў адукацыі.

Па меркаванні Аляксандра Турчына, у першую чаргу неабходна звярнуць увагу на асацыяльных непрацоўных, якія ствараюць пагрозу для грамадства, сваёй сям'і, суседзям. А таксама на людзей, занятых у ценявым бізнесе, падказаць ім, як правільна плаціць падаткі, удзельнічаць у дзяржаўных расходах, працаваць легальна. Вопыт работы Чэрвеньскага раёна, па словах кіраўніка цэнтральнага рэгіёна, павінен быць распаўсюджаны на ўсю Мінскую вобласць.

Аляксандр Турчын звярнуў увагу прысутных, што значная роля ў працаўладкаванні незанятых у эканоміцы належыць сельскім Саветам. Дэпутаты ведаюць мясцовых жыхароў, іх лад жыцця.

— Над пытаннямі занятасці мы працуем на працягу некалькіх гадоў, — заўважыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.** — Пэўная катэгорыя грамадзян у нашай краіне не працуе. Пры гэтым спажывае дзяржаўныя даброты, паслугі, прычым на льготных умовах. Гэта жыллёва-камунальныя паслугі, медыцынскія, адукацыйныя, транспартныя. У Канстытуцыі прапісаны не толькі сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы перад чалавекам, але і абавязацельствы грамадзяніна перад дзяржавай. Мы яшчэ раз прааналізавалі, як складваецца сітуацыя з незанятымі ў эканоміцы ў Мінскай вобласці на прыкладзе Чэрвеньскага раёна. Галоўнае — разабрацца ў тым, па якой прычыне не працуе чалавек. Зыходзячы з гэтага, трэба прымаць адпаведныя меры. Яны павінны быць адраснымі. Калі чалавек не працуе на працягу пяці гадоў, то праверыць, на якія даходы ён жыве, — у кампетэнцыі падатковых органаў. Калі чалавек вядзе асацыяльны лад жыцця, то мы разумеем, чыя гэта зона адказнасці і хто павінен з ім працаваць.

Звярнула Ірына Касцевіч увагу і на такую катэгорыю, як маладыя людзі да 31 года, што занесены ў базу незанятых у эканоміцы. Па словах міністра, іх неабходна максімальна прыцягнуць на рынак працы, пакуль яны не страцілі жадання, навыкаў, кваліфікацыі, якую атрымалі ў прафтэхвучылішчах, каледжах.

На нарадзе намецілі планы па далейшай рэалізацыі Дэкрэта № 3, вызначылі меры па рабоце з кожнай катэгорыяй грамадзян. Праз пэўны час да гэтага пытання вернуцца, каб прааналізаваць канкрэтныя вынікі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сталіцу Казахстана зноў будуць называць Астаной



Члены абедзвюх палат парламента Казахстана прынялі ў двух чытаннях закон аб папраўках у канстытуцыю, якія прадугледжваюць увядзенне аднаразовага сямігадовага прэзідэнцкага тэрміну і вяртанне сталіцы рэспублікі ранейшай назвы Астана. Трансляцыя сумеснага пасяджэння палат праходзіла ў рэжыме анлайн на сайце заканадаўчага органа, паведаміла ТАСС. Як паведаміў старшыня Мажыліса (ніжняй палаты) Ерлан Кашанаў, дэпутаты аднагалосна прагаласавалі за прыняцце закона. Як вядома, у верасні прэзідэнт Касым-Жамарт Такаеў ініцыяваў новыя змены Канстытуцыі, прапанаваўшы, у прыватнасці, дазволіць абірацца кіраўніком дзяржавы толькі на адзін тэрмін, але павялічыць яго да сямі гадоў. Перайменаваць сталіцу ў Астану ў рамках канстытуцыйнай рэформы прапанавала група дэпутатаў. Днямі стала вядома, што Такаеў ухваліў уключэнне гэтай папраўкі ў канстытуцыйны пакет. Як заявіў Ерлан Кашанаў, прынятыя ўчора парламентам папраўкі ў Канстытуцыю Казахстана канчатковыя, яны адкрываюць шлях пераходу дзяржавы да новай палітычнай мадэлі.

### Ахвярамі паводкі ў Італіі сталі не менш чым восем чалавек



На ўсходзе Італіі ў мясцовасці Марке з-за магутных лівеняў пачалася паводка, ахвярамі стыхіі сталі восем чалавек, яшчэ чацвёра лічацца зніклымі без вестак, паведаміла ANSA. У ноч на 16 верасня на рэгіён нечакана абрынуўся магутны лівень, за дзве-тры гадзіны выпала каля 400 міліметраў ападкаў, у некалькіх гарадах затапіла вуліцы, дамы і дарогі. Аднаго з загінулых знайшлі ў затопленым аўтамабілі. Сярод зніклых ёсць жанчына з васьмігадовым дзіцем. Аператыўна былі арганізаваны выратавальныя работы. З затопленых дамоў людзей вывозілі на плытах, аднаго мужчыну знялі з дрэва. У асобных населеных пунктах няма электрычнасці. Рэгіянальны саветнік па абароне насельніцтва Стэфана Агуцы заявіў ANSA, што такой залевы ніхто не чакаў, да паводкі не рыхтаваліся, стыхія заспела людзей у тым ліку ў дарозе.

### Лаўрэаты Шнобелеўскай прэміі атрымалі па 10 трыльёнаў зімбабвійскіх долараў



Сінхранізацыя сардэчнага рытму ў закаханых з першага погляду, кручэнне дзвярной ручкі і гумовы лось у натуральную велічыню адзначаны Шнобелеўскай прэміяй на 32-й штогадовай цырымоніі. Аб гэтым паведамілі арганізатары цырымоніі. Прэмія, заснаваная ў 1991 годзе, прысуджаецца «за дасягненні, якія спачатку смешаць, а потым прымушаюць задумацца». Звычайна цырымонія ўзнагароджання праходзіць у Гарвардзе за некаторы час да Нобелеўскага тыдня, а прэміі ўручаюць сапраўдныя Нобелеўскія лаўрэаты. Сёлета яе трэці раз запар правялі анлайн з-за пандэміі, трансляцыю вёў сайт выдання the Annals of Improbable Research. Прызы дасылаліся па электроннай пошце. Гэта папяровы цыліндрычны кантэйнер, які можна раздрукаваць, склеіць і выкарыстоўваць для захоўвання вады, грамата і купюра ў 10 трыльёнаў зімбабвійскіх долараў, якая выйшла з абароту.

З нагоды

# ПРА ТЫХ, ХТО НЕ СТАЎ НА КАЛЕНІ

## У сумна вядомых Чырвоных казармах Бяроза-Картузскага лагера адкрылася пастаянная экспазіцыя

**Да Дня народнага адзінства Бярозаўскі гісторыка-краязнаўчы музей падрыхтваў пастаянную экспазіцыю, якая размясцілася ў сумна вядомых Чырвоных казармах. Тут з 1934 года да верасня 1939 знаходзіўся канцэнтрацыйны лагер «Бяроза-Картузская».**


Фота БелТА.

Зараз у былым памяшканні лагернай адміністрацыі размяшчаецца гандлёвы цэнтр, у суседнім — дзіцячая бібліятэка, галерэя мастацтваў, цэнтр рамёстваў. Для экспазіцыі знайшлося месца на першым паверсе адной з казармаў. Летась, калі адзначалі Дзень народнага адзінства ўпершыню і адкрывалі побач адноўлены помнік, краязнаўчы музей зладзіў тут часовую экспазіцыю. Цяпер падрыхтавалі пастаянную.

Наведвальнікі, для якіх адкрыты тры залы, могуць паглядзець на адноўлены карцар і камеру, у якіх у нечалавечых умовах утрымлівалі людзей. Адна зала паказвае камеры вязняў. Экспазіцыя таксама змяшчае арыгіналы дакументаў, лістоўкі, транспаранты, асабістыя рэчы тых, хто прайшоў зняволенне. Можна пачытаць успаміны былых вязняў, а таксама ўзяць акуляры віртуальнай рэальнасці і паглядзець панараму тэрыторыі канцлагера. Працу відэагід. Матэрыялamі з бярозаўскімі музейшчыкамі падзяліліся Нацыянальны гістарычны і Брэсцкі абласны краязнаўчы музеі.

**Старшы навуковы супрацоўнік Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея Галіна КРАЎЧУК** расказала, што экспазіцыя пра лагер «Бяроза-Картузская» ў іх музеі працуе з 1965 года. А цяпер у філіяле «Галерэя мастацтваў» падрыхтаваная зусім новая экспазіцыя, тут сабраны матэрыялы, якія да гэтага захоўваліся ў фондах. Па сутнасці, прадстаўлены лагер у мініяцюры, які можна ўбачыць з дапамогай інтэрактыву. Кожная дэталь, кожны экспанат адноўлены, паводле ўспамінаў былых вязняў, тых з іх, хто правёў у гэтым страшным месцы не адзін месяц.

Напрыклад, «паліцэйскі калідор», праз які праганялі няшчаснага. Па абодва бакі «калідора» стаялі паліцэйскія з дубінкамі, а вязню трэба было прабегчы пад ударамі. Цяжэй за ўсё было таму, хто падаў, такіх білі з двайной сілай. Наогул, у лагеры забаранялася хадзіць пешшу, вязні мусілі бегаць, прычым па камандзе.

Самым страшным месцам быў карцар, дзе людзей трымалі без святла, ежы і адпачынку. У памяшканні не было нават нар, сядзець даводзілася на бетоннай ледзяной падлозе. Яшчэ адным відам пакарання была «крывавая дарожка». У экспазіцыі ёй адведзена асаблівае месца. На сцяне адлюстраваны вязень, які паўзе па вострых, як шкло, аскепках цэглы. За ім застаецца тая самая крывавая дарожка. Амаль ва ўсіх успамінах згадвалася пра гэтую экзекуцыю.

Польскі рэжым змяшчаў сюды найперш нязгодных з ім. У розныя гады тут сядзелі Мікалай Максімовіч, у 1961—1981 гадах — рэктар Львоўскага ўніверсітэта, Уладзімір Гуль, у 1960—1970 гады старшыня Нясвіжскага гарсавета, актыўныя члены КПЗБ Іосіф Жылюк, Іван Калеснікаў, Вера Ісхрык, украінскі паэт Аляксандр Гаўрылюк. Апошні сядзеў двойчы і ў лагеры пачаў пісаць сваю паэму «Песня з Бярозы». Калі ў яго знаходзілі шматок паперы з радкамі, паэта білі, а запісы знішчалі. Тады Аляксандр вучыў на памяць уласныя радкі, дыктаваў таварышам, каб запаміналі, а пасля выхаду на волю ўзнавіў запісы. На беларускую мову паэму пераклала Ніна Мацяш. «Мы — мацнейшыя за стыхію, мы — людзі», — напісаў паэт Гаўрылюк, і гэтая думка грэла душу ўсім, хто знаходзіўся за кратамі.

У 1967 годзе была зладжана сустрэча былых вязняў Бяроза-Картузскага лагера. Успаміны, сведчанні яе ўдзельнікаў потым увайшлі ў зборнік «Яны не сталі на калені». Цяпер кніга ўяўляе сабой бясцэнны матэрыял для музея.

Паводле розных ацэнак, праз лагер прайшло ад 10 да 13 тысяч чалавек: беларусы, украінцы, яўрэі, палякі, немцы, нават адзін кітаец. Афіцыйна пацверджана гібель 13 вязняў, адзін чалавек не вытрымаў здзекаў і перарэзаў сабе горла. Але насамрэч, хутчэй за ўсё, ахвяр было больш, перыядычна ўспыхвалі інфекцыйныя хваробы, людзей адпраўлялі ў бальніцы, дзе яны паміралі.

Адзіны ў Бярозаўскім раёне сведка тых падзей Фёдар Труцько, бацька якога быў вязнем лагера амаль год, наведаў выставу адным з першых. Яму, 90-гадоваму, цяжка даюцца ўспаміны пра роднага чалавека, які прайшоў лагернае пекла: «Не ведаю, як адны людзі маглі так здзекавацца з іншых», — гаварыў Фёдар Сцяпанавіч.

А бярозаўскі краязнаўца Яўген Сяленя, які падрабязна вывучаў матэрыялы, падрыхтаваў нямала артыкулаў пра Бярозу-Картузскую, гаварыў аўтару гэтых радкоў пра тое, што забываць драматычную старонку гісторыі не варта найперш таму, каб ніколі такое больш не паўтаралася, каб падобныя аб'екты ці мясціны былі музеямі альбо іншым чынам служылі людзям.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Чулі?

# БЕЗ АЎТО!

## У Мінску пачаўся Тыдзень мабільнасці

**Штогод жыхары і госці Мінска прымаюць удзел у гэтай акцыі, якая накіравана ў першую чаргу на экалагічнасць горада. Цвіком праграмы стане «Дзень без аўтамабіля», які пройдзе ў чацвер, 22 верасня — тады Тыдзень мабільнасці і завершыцца. Па словах намесніка старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяны ДУБІК, да распачатай акцыі аформлены план мерапрыемстваў.**

— Гэта штогадовая кампанія, якая накіравана на азеляненне гарадскіх транспартных сістэм, змяненне транспартных паводзін людзей, а таксама больш разумнага выкарыстання грамадскіх гарадскіх прастор. У Мінску запланаваны розныя мерапрыемствы, праграмы для дзяцей і моладзі, конкурсы, флэшмобы, круглыя сталы, дзе будуць абмяркоўвацца праблемы развіцця грамадскага транспарту, актыўнага ладу жыцця і экалогіі.

17 верасня, у Дзень народнага адзінства, пройдзе плогінг-забег у парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Плогінг — гэта экалагічны рух, пры якім бег трушком спалучаецца са зборам смецця. Як гаворыцца, прыемнае з карысным! Гэтая акцыя праводзіцца сумесна з Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэтам спажывецкай кааперацыі.

Мінчанам важна зразумець каштоўнасць такіх мерапрыемстваў. Статыстычныя даныя паказваюць, што 85 % выкідаў, забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра адносяцца да аўтамабіляў. Астатнія 15 % — гэта прамысловыя прадпрыемствы Мінска. Пры гэтым найбольш забруджванне паветра адбываецца ў ранішнія і вячэрнія «час пік» пры максімальнай загрузцы сталічных дарог.

У заключны дзень будзе праведзена акцыя «На працу на веласіпедзе». Таксама ў некалькіх месцах Мінска будуць раздаваць садавіну веласіпедыстам і іншым удзельнікам дарожнага руху, якія адмовіліся ад аўтамабіля і дабіраюцца да працы пешшу. Вось дзе гэта будзе адбывацца:

1. Уваход у Цэнтральны батанічны сад на пр-це Незалежнасці;
2. Веладарожка каля «Мінск-Арэны» (пр-т Пераможцаў, 111);
3. «Мотавелазавод» (пр-т Партызанскі, 8);
4. Станцыя метро «Грушаўка» (пр-т Дзяржынскага, 11).

— Для найбольшай зацікаўленасці і прыцягнення ўвагі грамадскасці да правядзення «Дня без аўтамабіля» эфектыўнай мерай з'яўляецца атрыманне права на бясплатны праезд у гарадскім грамадскім транспарце. Таму і сёлета прадпрыемствам «Мінсктранс» і «Мінскі метрапалітэн» указана не спаганяць плату за праезд пры прад'яўленні пасажырам пасведчання кіроўцы і пасведчання аб рэгістрацыі транспартнага сродку. Так, колькасць асоб, якія скарысталіся правам бясплатнага праезду ў метрапалітэне ў ходзе экалагічнай акцыі ў 2021 годзе, склала больш за 10 тысяч чалавек», — расказала Таццяна Дубік.

Да акцыі «Дзень без аўтамабіля» таксама падключаюцца сучасныя і маладзёжныя сродкі перамяшчэння. Усім ахвотным 22 верасня дадуць зніжку на арэнду шэрынгавых веласіпедаў і электрасамакатаў па прамакодзе «Без аўто». Акрамя таго, у чацвер будзе праведзены велапрабег, прысвечаны адначасова «Дню без аўтамабіля» і Году гістарычнай памяці. Маршрут велапрабегу будзе ўключаць экалагічныя і знакавыя гістарычныя месцы.

**Аляксей КАРПУК.**

Ну і ну!

# ТЭЛЕФОННЫЯ АФЕРЫСТЫ ВЫМАНІЛІ Ў БЕЛАРУСАЎ БОЛЬШ ЗА $4 МЛН

**Аб гэтым расказаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС Дзмітрый БУРДЗЮК.**

Раскрывальнасць злачынстваў у адносінах да пажылых людзей, якія ўчыняюцца пад маркай аказання дапамогі сваякам, якія нібыта трапілі ў ДТЗ, складае амаль 80 працэнтаў. Сёлета першае паведамленне аб такім відзе махлярства было зафіксавана ў Барысаве ў сярэдзіне сакавіка. Потым яны сталі рэгістравацца ва ўсіх рэгіёнах краіны. Пік злачыннай актыўнасці прыпаў на май і чэрвень. Але дзякуючы шырока арганізаванай інфармацыйна-прафілактычнай рабоце, а таксама ўстанаўленню і затрыманню кур'ераў, хвалю махлярстваў удалося збіць. На сёння следчыя распачалі ўжо 592 крымінальныя справы, з якіх у 463 выпадках падазроныя ўстаноўлены. Пры гэтым агульная сума нанесенага ўрону грамадзянам перасягнула $4 млн.

Па словах Дзмітрыя Бурдзюка, на хітрыкі аферыстаў часцей за ўсё трапляюцца жанчыны ва ўзросце ад 60 гадоў. Адзначаецца, што ў сталіцы з больш як 400 пацярпелых толькі 43 ахвяры тэлефонных ашуканцаў з'яўляюцца мужчынамі. Што да кур'ераў, то імі часцей за ўсё становяцца людзі ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў без пэўнага роду заняткаў.

Усе кур'еры былі дасведчаныя аб крымінальным характары сваёй дзейнасці. За выкананне яны атрымлівалі ад 5 да 15 працэнтаў ад сумы. Аб'явы з такімі прапановамі знаходзяць у тэматычных тэлеграм-каналах, якія прысвечаны пошуку пастаяннай працы або падпрацоўкі.

Пасля затрымання кур'еры, як правіла, аказваюць садзейнічанне праваахоўным органам, аднак іх дасведчанасць не распаўсюджваецца далей за імя (нікнэйм) вярбоўшчыка і куратара ў месенджары. У сярэднім кур'ер да яго затрымання ажыццяўляе не больш за тры ці чатыры перадачы. Арганізатары злачыннай схемы ўсведамляюць высокую ступень верагоднасці іх затрымання. Таму імкнуцца, каб грошы на руках у кур'ера знаходзіліся мінімальна магчымы час. Для забеспячэння ананімнасці і захаванасці наяўныя грошы пераводзяцца ў крыптавалюце. Пошукам асобы, якая здольна аказаць паслугі па канвертацыі, займаюцца непасрэдна арганізатары злачынства. Кур'ер пры наяўнасці валюты робіць яе абмен на беларускія рублі, а пасля з выкарыстаннем розных прылад банкаўскага самаабслугоўвання пераводзіць грошы на рахунак, рэквізіты якога атрымлівае ад куратара. Для вываду грашовых сродкаў за межы Беларусі злачынцы аддаюць перавагу Bitcoin.

«На жаль, у большасці выпадкаў кур'еры паспяваюць перавесці грошы арганізатарам. Гэта адбываецца таму, што пацярпелыя звяртаюцца ў міліцыю толькі праз некаторы час (ад 3-4 гадзін да сутак), калі ўжо пра здарэнне даведаюцца родныя», — адзначыў Дзмітрый Бурдзюк. У сувязі з гэтым у МУС нагадваюць аб неабходнасці давядзення прафілактычнай інфармацыі да пажылых сваякоў. «Растлумачце, што следчы або міліцыянер ніколі не будзе тэлефанаваць і прасіць перадаць грашовыя сродкі. Няхай таксама звяртаюць увагу на нумар тэлефона, з якога паступае званок, — як правіла, размова ідзе аб замежных нумарах», — падкрэсліў намеснік начальніка ГУУР МУС. — «Не варта падтрымліваць дыялог, трэба перапыніць званок і самомуператэлефанаваць сваяку. Аб тым, што здарылася, неабходна неадкладна паведаміць у міліцыю».

**Пётр ДУНЬКО.**



# «АДЗІНСТВА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА БЫЛО ЗАКЛАДЗЕНА МЕНАВІТА 17 ВЕРАСНЯ»



**Другі год у Беларусі адзначаецца Дзень народнага адзінства. Па ўсёй бачнасці гэта свята, як і сама яго ідэя, набывае новы сэнс. Магчыма, яно стане той кропкай апоры, што здолее прывесці наша грамадства да супольнасці, якая задаволіць кожнага беларуса. Між тым будучы рух немагчымы без усебаковага асэнсавання мінулага. Аб тым, як сумясціць гэтыя аспекты — гістарычны і сучасны, — а таксама рэалізаваць ідэю адзінства, мы пагутарылі з прафесарам кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, доктарам гістарычных навук Эдмундам ЯРМУСІКАМ.**

***— Эдмунд Станіслававіч, якое ваша асабістае ўспрыманне гістарычнай даты 17 верасня? З чым яна ў вас асацыюецца як у простага чалавека, жыхара заходняй часткі Беларусі?***

— Калі «не ўключаць» гісторыка, можна прыгадаць жыццё маіх бацькоў і дзядоў, якія здаўна жылі ў Заходняй Беларусі. У той час «польскай». Дык вось, мой бацька расказваў, як цяжка жылося яго бацькам у гэтай польскай Заходняй Беларусі. Вельмі цяжка. Гаспадарка была невялікая, ледзь зводзілі канцы з канцамі, даходаў іншых не было. І самае галоўнае — мой дзед Юзаф памёр у красавіку 1939 года, бо яму не маглі зрабіць аперацыю. А чаму? Бо за аперацыю трэба было вельмі многа заплаціць, трэба было прадаць карову. А ў сям'і трое малых дзяцей. Дзед памёр, а мой бацька, якому было 11 гадоў, застаўся старэйшым і стаў за плуг, каб пракарміць астатніх. Вось такая сямейная гісторыя таго, як жылося «за Польшчай».

***— А калі «ўключыць» гісторыка... Якія аспекты самыя важныя ва ўспрыманні гэтай даты?***

— На падзеі 1939 года трэба глядзець з пункту гледжання геапалітыкі. Менавіта ў заходнім рэгіёне за будучыню беларускай дзяржаўнасці ішла самая напружаная барацьба. Польскі ўрад нават у эміграцыі не пакідаў ідэі вяртання «Крэсаў усходніх» — дзейнічала антысавецкае падполле, якое пераўтварылася пасля ў Армію Краёву. А новая савецкая ўлада рабіла ўсё, каб захаваць адзінства гэтай тэрыторыі. І барацьба працягвалася да пачатку 1950-х гадоў. Наколькі гэта было актуальна нават у гады вайны, можна зразумець толькі па адной цытаце. У закрытым лісце ЦК КПБ нелегальным абкамам партыі і Беларускаму штабу партызанскага руху «Аб ваенна-палітычных задачах работы ў заходніх абласцях БССР» ад 2 жніўня 1943 года сказана: «Падпольныя цэнтры і партызанскія атрады, арганізуючы і ўзначальваючы барацьбу народа, павінны развіваць яе на той аснове, што заходнія вобласці Савецкай Беларусі з'яўляюцца неад'емнай часткай БССР, неад'емнай тэрыторыяй СССР». У гэтых радках якраз і квінтэсэнцыя ўсяго таго, што адбывалася ў той складаны перыяд з пункту гледжання геапалітыкі. Праблема засталася і пасля вайны, калі па дазволе Сталіна граніцу перасунулі на ўсход, і той жа Беласток апынуўся ў Польшчы, хаця кіраўніцтва БССР было за захаванне граніцы на ўзроўні восені 1939-га.

***— У сённяшнім свяце, я так бачу, значнае месца займае менавіта гістарычны пасыл?***

— У кожным перыядзе гісторыі ёсць даты, якія аказваюць вызначальны ўплыў не толькі на лёсы людзей, што пражывалі на дадзенай тэрыторыі ў дадзены перыяд часу, але надоўга застаюцца ў гісторыі. Тут трэба згадаць 18 сакавіка 1921 года, калі лёс паслаў выпрабаванні беларускаму народу. Бо, не паспеўшы атрымаць дзяржаўнасць сваю, нацыянальную, гэты народ быў раздзелены напалову, па-жывому як у тэрытарыяльным, так і ў этнічна-нацыянальным плане. І гэта мяжа аказала ўплыў на беларусаў на цэлыя дзесяцігоддзі.

Калі коратка акрэсліць становішча беларускага насельніцтва ў Заходняй Беларусі падчас польскай акупацыі — гэта найперш нацыянальны ціск з боку польскай дзяржавы. Беларусаў абмяжоўвалі, напрыклад, у праве вучыцца на сваёй мове, адкрываць свае школы. Усё гэта было абумоўлена адпаведнымі законамі, інструкцыямі, актамі... У той час як у БССР усім была даступная адукацыя на роднай мове. І гэта толькі адзін з прыкладаў.

Такім чынам, свята 17 верасня для беларускага грамадства, для Рэспублікі Беларусь — гэта і напамін аб тым, у якіх няпростых, складаных, міжнародных, палітычных умовах адбывалася злучэнне дзвюх частак аднаго народа. Адназначна можна сцвярджаць, што пры ўсіх нюансах гэтага працэсу без таго ўз'яднання беларускага народа праблематычна было б гаварыць і пра існаванне суверэннай Беларусі.

***— Такім чынам, гэту падзею можна лічыць знакавай у станаўленні дзяржаўнасці...***

— Падзея знакавая ў тым сэнсе, што яна вызначыла будучыню беларускага народа ў цэлым і, адпаведна, беларускай дзяржаўнасці. Трэба сказаць, што 17 верасня як свята, як дзень аб'яднання адзначалася афіцыйна да 1949 года. Калі ж Польшча ўсталявалася ў сацыялістычным блоку, тэма «Крэсаў усходніх» замоўчвалася, хоць аб ёй у Варшаве не забыліся. І яна ўсплыла ў 1980-я гады, калі ў Польшчы пачала актыўна дзейнічаць «Салідарнасць». З таго часу і да сёння гэта тэма ў нашых заходніх суседзяў на слыху. У памяці, у ментальнасці палякаў прэтэнзіі на гэтыя тэрыторыі будуць захоўвацца. І пра гэта трэба гаварыць і памятаць.

Разам з пераацэнкай многіх гістарычных падзей ідзе асэнсаванне і стану сённяшняга грамадства. Тое, што 17 верасня аб'яўлены Указам Прэзідэнта як Дзень народнага адзінства, невыпадкова. Таму што падзеі, якія адбыліся ў 2020 годзе, паказалі, што ёсць неабходнасць успомніць гэту дату і акрэсліць яе ў новым сучасным грамадстве як дату аб'яднання беларусаў. Гэтым самым паказаць, што і зараз грамадству таксама неабходна аб'ядноўвацца. І тут варта, каб гэта адзінства адчуў увесь народ.

***— Ці можна ў такім выпадку сказаць, што гэта прынцыпова новае для беларусаў свята?***

— Мабыць, тут справа не ў самім свяце, а ў тым, як яно ўспрымаецца кожным чалавекам. Менавіта кожным. І гэта не павінна быць просты фармальнасцю. Бо тады і людзі будуць ставіцца да яго такім жа чынам. Я лічу, што гэта падзея павінна натхняць усіх — і гісторыкаў, і аматараў, і студэнтаў, і вучняў, — каб больш глыбока і аб'ектыўна, праўдзіва разабрацца ў тых няпростых падзеях, што адбываліся на нашых землях 17 верасня 1939 года. Не трэба баяцца праўды. Праўда, аб'ектыўнасць, навуковасць — вось што важна для таго, каб ацэньваць падзеі 17 верасня.

***— Як вы лічыце, ці дастаткова ў нас помнікаў у гарадскім асяроддзі, якія звязаны з гэтай датай? Ці трэба пашыраць гэту тэму?***

— Гэта традыцыя любой дзяржавы. Сваіх вядомых дзеячаў, якія ўнеслі ўклад у развіццё дзяржаўнасці, якраз мемарыялізуюць у назвах вуліц, навучальных установах, прадпрыемствах і гэтак далей. Што датычыцца падзей 17 верасня, такіх месцін у горадзе нямала. Увекавечаны прозвішчы дзеячаў Кампартыі Заходняй Беларусі, тых, хто прымаў удзел у вызваленчай кампаніі, як чырвонаармейцы, так і мясцовыя жыхары. Думаю, гэты працэс будзе працягвацца. І тут усё залежыць ад ініцыятыў грамадскасці і ўлад.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

### У тэму

У Гродзенскай вобласці налічваецца некалькі дзясяткаў вуліц, якія носяць назву «17 верасня». Такія вуліцы ёсць не толькі ў раённых цэнтрах, як, напрыклад, Слонім і Свіслач, але і ў невялікіх населеных пунктах. А ў мінулым годзе ў Шчучыне да Дня народнага адзінства быў устаноўлены першы ў рэгіёне памятны знак, прысвечаны гэтай даце.





У абласным цэнтры ёсць вуліца не толькі 17 верасня, але і вуліцы, якія носяць імёны людзей, звязаных з падзеямі 1939 года. Гэта вядомы партыйны дзеяч Сяргей Прытыцкі, удзельнікі падпольнага руху Валянцін Таўлай і Піліп Пестрак, байцы Чырвонай Арміі Квятко, Гарнавых, Болдзін, мясцовы актывіст Аляксандр Бертэль.

---

Святкуем разам

# ЯДНАННЕ ПРАЗ КУЛЬТУРУ

**У Доме прэсы адбылася сустрэча работнікаў культуры, прымеркаваная да Дня народнага адзінства. Удзельнікамі прэс-канферэнцыі сталі прадстаўнікі сталічнага рэгіёна і абласцей краіны. Спікеры распавялі аб галоўных мерапрыемствах і праектах, якія адбудуцца падчас свята, а таксама абмеркавалі шляхі яднання грамадства праз культуру.**

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры Іна АДАМОВІЧ** расказала, што мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня народнага адзінства, праходзяць ужо з пачатку верасня.

— Тыдзень стартаваў з культурных акцый. Так, 13 верасня ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылося ўшанаванне работнікаў культуры за правядзенне шэрагу мерапрыемстваў, якія ў тым ліку садзейнічаюць кансалідацыі беларускага грамадства, — адзначыла Іна Адамовіч.

У Палацы Незалежнасці 14 верасня пачаў працаваць жывапісна-музычны праект «Да Беларусі — з любоўю і пяшчотай». У экспазіцыю ўвайшлі работы трох жывапісцаў розных пакаленняў: Мікалая Ісаёнка, Ганны Садоўскай і Ганны Конанавай. Гасцям музычныя выступленні прадставілі таленавітыя маладыя музыкі і акцёры з Мінска і рэгіёнаў Беларусі — хлопцам і дзяўчатам далі ўнікальную магчымасць выступіць у Палацы Незалежнасці. Падчас канцэртнай часткі праграмы прагучала беларуская і сусветная класіка.

Галоўным мерапрыемствам, прымеркаваным да Дня народнага адзінства, стане правядзенне патрыятычнага форуму на найбуйнейшай пляцоўцы сталіцы «Мінск-Арэна», паведаміла Іна Адамовіч.

— Удзел у форуме прыме каля дзевяці тысяч чалавек са сталіцы і ўсіх абласцей. Асноўнай ідэяй свята стане паказ адзінства народа праз прызму розных перыядаў і падзей айчыннай гісторыі. Канцэртная праграма будзе ўяўляць сабой касцюміраванае гістарычнае шоу, заснаванае на пастановачных эпізодах з выкарыстаннем сучасных тэхналогій. Сюжэт — па храналагічным прынцыпе гісторыі і развіцця Беларусі: у канцэрце прымуць удзел вядучыя артысты і выканаўцы краіны, а таксама маладыя таленты і прадстаўнікі рэгіёнаў.

Працягваючы размову аб кансалідацыі праз творчасць і культуру, **генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ** адзначыў, што супрацоўнікамі ўстановы і творчай інтэлігенцыяй у межах Дня народнага адзінства быў падрыхтаваны шэраг мерапрыемстваў:

— У мінулую суботу ў музеі адкрылася выстава, прысвечаная Марку Шагалу. Акрамя канцэртнай праграмы на базе музея, 17 верасня адкрыецца выстаўка работ навучэнцаў школы-гімназіі імя Масленікава, якая прысвечана вялікай гістарычнай падзеі — Дню народнага адзінства. Праз мастацтва і нашы праекты мы хацелі б паказаць талент нашых дзяячаў і тую гістарычную праўду, якая была і ёсць.

У сваю чаргу **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМОЙ** распавёў, што на базе ўстановы плануецца правядзенне круглага стала, падчас якога ўзнагароды атрымаюць удзельнікі творчых конкурсаў.

— Да Дня народнага адзінства наш музей падрыхтаваў лекцыйны матэрыял і дыялогавую пляцоўку. Разам з абласнымі і рэспубліканскімі музеямі 14 верасня мы правялі семінар, падчас якога падсумавалі леташні досвед працы па святкаванні Дня народнага адзінства. Акрамя таго, сумесна з аддзелам ідэалогіі Ленінскага раёна нашы навуковыя супрацоўнікі на працягу верасня наведваюць працоўныя калектывы з лекцыямі. Каб максімальна поўна расказаць пра свята, мы таксама запрашаем іх да сябе ў музей.

Вялікі тэатр Беларусі таксама падрыхтаваў святочную праграму да Дня народнага адзінства. Знамянальнай даце тэатр прысвяціў спектакль «Дзікае паляванне караля Стаха» 17 верасня. Аб гэтым расказала **народная артыстка Беларусі, загадчыца трупы оперы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Анастасія МАСКВІНА:**

— Праз мастацтва мы знаёмім моладзь з класікай не толькі літаратурнай, але і музычнай. А таксама аб'ядноўваем усе пакаленні беларусаў.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# 500 «ДЗІЦЯЧЫХ» МЕТРАЎ НА ДАРОСЛЫМ ПАЎМАРАФОНЕ

## МТС і ЮНІСЕФ зладзілі дзіцячы забег для малых ад 3 да 12 гадоў

**Больш за паўтары тысячы маленькіх спартсменаў пераадолелі 500-метровую дыстанцыю па трасе, на якой да гэтага спаборнічалі ў межах Мінскага паўмарафону за званне самых хуткіх аматары здаровага ладу жыцця. У адрозненне ад дарослых бегуноў, жаданы «медаль чэмпіёна» ад арганізатараў – кампаніі МТС і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) – атрымаў кожны ўдзельнік дзіцячага забегу.**



Вялікая сямейная каманда.



Міхась – удзельнік двух забегаў.

### Унёсак у дабрачыннасць

Ладзіць дзіцячы забег, які праходзіць у межах Мінскага паўмарафону на дарослай трасе, стала традыцыяй для кампаніі МТС. Такім чынам малыя адчуваюць сябе часткай дарослай каманды, лічыць **Марыя ПАЗНЯК, кіраўнік PR-групы кампаніі МТС:**

*— Дзеці з задавальненнем чакалі пачатку, і многія ўдзельнічалі і ў дарослым забегу, так што паўмарафон увогуле атрымаўся вельмі сямейны. Мерапрыемства штораз збірае тысячы дзяцей, якія хочуць стаць часткай маштабнай з'явы. А для бацькоў гэта цудоўная магчымасць натхніць малых і далей прытрымлівацца здаровага ладу жыцця.*



Многія са спартсменаў былі апрануты ў футболкі з сімволікай праекта. Такую форму можна было атрымаць за данат — дабрачынны ўнёсак, які рабілі бацькі, рэгіструючы малога да ўдзелу ў забегу на сайце move4Good.by, дзе, дарэчы, сабрана шмат карыснай інфармацыі пра спорт.

Атрыманыя сродкі ЮНІСЕФ накіруе на набыццё дапаможнага абсталявання для дзетак з інваліднасцю, каб яны маглі вучыцца ў звычайных школах, падкрэсліла **Дар'я ЛЫСКАВЕЦ, каардынатар па развіцці партнёрства з бізнесам Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ):**

*— Камусьці з малых патрэбна спецыяльная парта, камусьці — спецыяльнае крэсла, аднак далёка не ва ўсіх школах ёсць падобныя прыстасаванні. Летась, напрыклад, мы набылі спецыяльнае крэсла для дзяўчынкі з ДЦП, бо са звычайнага яна спаўзала. Плюс купілі спецыяльныя павелічальнікі, каб яна магла бачыць, — цяпер зможа пайсці ў восьмы клас. У падтрымку праекта беглі і вядомыя беларусы. Спадзяёмся, што на наступны год забег будзе яшчэ больш масавы.*

Move4Good — дабрачынны інклюзіўны спартыўны праект ЮНІСЕФ, які падтрымлівае кампанія МТС. Ён распачаўся з анлайн-трэніровак, а кульмінацыяй стаў дзіцячы забег.

*— Роўнае стаўленне да ўсіх дзетак, у тым ліку да малых з інваліднасцю, — важны крок на шляху да інклюзіўнага грамадства, дзе кожны адчувае сябе каштоўным і можа рэалізаваць свае правы і магчымасці нароўні з усімі. І мы вельмі рады, што так шмат людзей падтрымлівае развіццё інклюзіі ў Беларусі,* — адзначыла **Тацццяна РАДАЧАЙ, прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі.**

### Паспець усюды

Нягледзячы на дажджлівае надвор'е і пранізлівы вецер, ахвотных паўдзельнічаць у забегу было шмат — спартсмены ледзьве ўмясціліся на старце насупраць галоўнай аркі стадыёна «Дынама». А ўнутры стадыёна перад забегам і пасля яго для дзетак працавалі забаўляльныя лакацыі ад арганізатараў, дзе малыя маглі паспрабаваць сябе ў якасці лёгкаатлетаў, праявіць здольнасці мастака і паказаць меткасць у гульнях.

Самыя маленькія хлопчыкі і дзяўчынкі, якім яшчэ не споўнілася шасці гадоў, прабеглі дыстанцыю разам з бацькамі. **Чатырохгадовы Дзіма**, напрыклад, з года займаецца спортам, кажа яго **мама Святлана,** якая разам з сынам прабегла 500-метровую дыстанцыю:

*— Мы заўжды падтрымліваем спартыўныя мерапрыемствы, а гэтым разам захацелі далучыцца да працэсу інклюзіі — падтрымаць дзетак, якія абмежаваны ў магчымасцях.*

А вось **дзевяцігадовы Міхась** паспеў за 42 хвіліны прабегчы пяцікіламетровую дыстанцыю на дарослым марафоне і паўдзельнічаць у дзіцячай 500-метроўцы. «Я бегаю пяць кіламетраў з 2018 года. Я абагнаў дзесяць тысяч дарослых!» — радасна падзяліўся хлопчык. «Мы беглі разам пяць кіламетраў, і ён мяне абганяў і крычаў «Мама, давай!» — пацвердзіла матуля Міхася.



Некаторыя прыходзілі на мерапрыемства цэлымі калектывамі. Прычым перш чым далучыцца да дзіцячага забегу, асобныя дарослыя паспелі прабегчы Мінскі паўмарафон. У адной з такіх вялікіх кампаній з калег, сяброў і сваякоў назбіралася, напрыклад, 40 дарослых і 12 дзетак.

*— Спачатку мы прабеглі са сваімі супрацоўнікамі і навучэнцамі паўмарафон, а потым сям'ёй, разам з нашымі жонкамі і дзецьмі, вырашылі паўдзельнічаць і ў дзіцячым забегу. Надвор'е выдатнае, настрой цудоўны,* — з імпэтам падзяліўся ўражаннямі адзін з удзельнікаў гэтай суполкі **Юрый КАМЯНЕЦКІ.** Ён паабяцаў, што на наступны год таксама абавязкова пабяжыць.

**Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ,**
**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Ірыны СІДАРОК і кампаніі МТС.**



Чатырохгадовы Дзіма і мама Света.



Юныя асілкі.




Самыя маленькія.

УНП 800013732 СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы»

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Шарковщинский агротехсервис», 211921, Витебская обл., Шарковщинский р-н, г. п. Шарковщина, ул. Краснодворская, 66, тел. 8 (02154) 4-16-01; факс: 8 (2154) 4-14-69.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 223/С-9117 площадью 848,0 кв. м по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, г. п. Шарковщина, ул. Вокзальная, 20Б/1, наименование – пункт технического обслуживания, назначение – здание специализированное иного назначения, находящееся на земельном участке с кадастровым № 225555100010000386 площадью 1,4452 га по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, г. п. Шарковщина, ул. Вокзальная, 20Б/1, целевое назначение – земельный участок для обслуживания пункта технического обслуживания (право аренды).

**Нач. цена: 20 040,00 бел. руб. с учетом НДС.**

**Задаток: 2 004,00 бел. руб**.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона**: **04.10.2022 в 12.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**.** Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 19.09.2022 с 8.30 по 03.10.2022 до 15.00. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Код операции 40901.** Ранее опубликованное извещение – газета «Звязда» 19.07.2022. **Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки; подписать договор купли-продажи предмета аукциона в течение 11 рабочих дней с даты проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. *Расходы Продавца по проведению независимой оценки составляют 360,00 бел. руб. с НДС.* **Повторный аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Доп. информацию по торгам можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 607-28-93, Русачёнок Сергей Александрович.

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества
УП «Пинская СПМК-5» (УНП 200111234),
объявляет о проведении **04.10.2022 г.** с 9.00 до 16.00
на электронной торговой площадке bankrottorg.by
электронных торгов в форме аукциона

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/09/spisok-imushhestvapmk.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296569865, Виктор.

Продавец: УП «Пинская СПМК-5».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **03.10.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **19.09.2022** по 17.00 **03.10.2022** на bankrottorg.by.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ – 360,00 бел. руб; стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; возмещение за оценку – 4155,07 бел. руб., аукционный сбор – 0,5 % от цены реализации имущества.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения электронных торгов.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор:
**Государственное опытное лесохозяйственное учреждение «Копыльский опытный лесхоз»**
*223927, Минская обл., г. Копыль, ул. Заозерная 2-я, 35, тел. +3751719 25219*

**Торги проводятся 17.10.2022 ЭТП «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by.**

**УАЗ 390945*360,** год выпуска 2012, 4 594,37 BYN с НДС.
**УАЗ 390994-310,** год выпуска 2008, 4 065,55 BYN с НДС;
**УАЗ 390995*360,** год выпуска 2012, 3 782,12 BYN с НДС;
**Легковой внедорожник универсал KIA SORENTO,** год выпуска 2008, 7 238,98 BYN с НДС.

Окончание приема заявлений – **12.10.2022.**

Подробная информация на сайте **www.et.butb.by**

УНП 600018703

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ»-управляющая компания холдинга» (Продавец)

**Аукцион состоится 30.09.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1, состав:**

1. Здание производственного корпуса с АБК, инв. № 500/С-30079, 2242,5 кв. м.
2. Склад неотапливаемый, инв. № 500/С-30078, 2404 кв. м.
3. Склад хранения материалов, инв. № 500/С-62721, 557,4 кв. м.
4. Склад хранения битума, инв. № 500/С-62722, 539 кв. м.
5. Здание диспетчерской, инв. № 500/С-62723, 36,8 кв. м.
6. Склад карбида, инв. № 500/С-62724, 26,7 кв. м.
7. Ливневая канализационная сеть, инв. № 500/С-1031132, 836,6 м.
8. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, инв. № 500/С-13011466, 587,7 м.
9. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть, инв. № 500/С-13011467, 651,3 м.
10. Прочее имущество:

- котел стальной твердотопливный на пеллетах КОП-58, инв. № 8633;
- шлагбаум автоматический, инв. № 8504;
- система видеонаблюдения, инв. № 4114;
- трансформатор ТНО б/у, инв. № 4026072;
- кран-балка г/п 3 т, инв. № 4132075;
- кран-балка АШ-162 г/п 1т, инв. № 4132076;
- внутриплощадочные электросети б/у, инв. № 318058;
- внутренние слаботочные сети б/у, инв. № 320069.

**Адрес: г. Минск, ул. Селицкого, 11, 11/1, 11/2, 11/3, 11/4, 11/5, 11 (КлК-1 - КлК-сущ.), 11 (ВпК-1 - ВпК-13), 11 (КбК-1 - КбК- сущ.).**

Обременения: действующие договоры аренды.

Земельный участок площадью 2,3042 га с кадастровым номером 500000000002000355. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 4 648 619,80 руб.**
**Задаток – 464 861,98 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона, – **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **28.09.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ВЫИГРЫВАЙ С ONLINER 25»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Заинтересованное лицо рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «МИ БАЙ», юридический адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, пом. 21, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 291478180, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 26.06.2017.

3. Сроки проведения рекламной игры: с 01.08.2022 по 10.10.2022 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4213 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 19.07.2022.

5. Количество участников рекламной игры – 948 чел.

6. Информация о призовом фонде:

размер призового фонда рекламной игры составляет 7420 (семь тысяч четыреста двадцать) белорусских рублей 00 (ноль) копеек. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

7. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | Шестель В.П. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 2 | Ардашникова С.И. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 3 | Трусковский П.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 4 | Тишкевич А.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 5 | Сак А.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 6 | Можаев Э.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 7 | Иванов П.Г. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 8 | Борисик Е.М. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 9 | Марков М.Г. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 10 | Дуброва Н.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 11 | Фролов А.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 12 | Менщиков Ю.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 13 | Юркевич М.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 14 | Стрельников В.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 15 | Пастерук А.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 16 | Шмагилев И.Ю. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 17 | Марков М.Г. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 18 | Яковец А.Ю. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 19 | Емельянов М.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 20 | Дуброва Н.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 21 | Грибовский А.Е. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 22 | Можаев Э.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 23 | Гумбатов Р.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 24 | Трубакова А.П. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 25 | Патракеев А.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 26 | Шелудько Е.И. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 27 | Радченко Н.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 28 | Наумов О.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 29 | Ефанов С.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 30 | Корх А.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 31 | Князев С.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 32 | Наливайко А.Г. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 33 | Дрило А.П. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 34 | Громак Д.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 35 | Марков М.Г. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 36 | Колин И.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 37 | Шинкарев Д.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 38 | Бараула П.К. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 39 | Дуброва Н.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 40 | Лобузов А.Ю. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 41 | Муха Е.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 42 | Трубачева Е.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 43 | Тишкевич А.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 44 | Колосов А.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 45 | Щербинский Е.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 46 | Махонь И.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 47 | Шадын Д.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 48 | Авсеенков В.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 49 | Ланова А.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 50 | Вилента А.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 51 | Ярмош Е.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 52 | Шемерей С.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 53 | Андреева В.О. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 54 | Званько Я.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 55 | Дуброва Н.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 56 | Марков М.Г. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 57 | Пашкевич А.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 58 | Широкий М.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 59 | Рубан О.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 60 | Войтов К.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 61 | Елисеев Д.И. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 62 | Шуманский Э.Ф. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 63 | Беляков А.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 64 | Егоров Ю.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 65 | Мешкуть А.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 66 | Дуброва Н.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 67 | Тихонов М.С. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 68 | Гуринович А.В. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 69 | Дуброва Н.Н. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |
| 70 | Нестерович А.А. | Приз – смарт-браслет Xiaomi Mi Smart Band 6 (XMSH15HM) |

8. Для получения приза победители должны явиться не позднее 10.10.2022 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24.

# ЛІХАМАНКА СТАРОГА СВЕТУ

## Што чакае Еўропу?



**Масавыя пратэсты могуць захліснуць Еўропу ва ўмовах суровай зімы. Такое меркаванне выказала дырэктар-распарадчык Міжнароднага валютнага фонду Крысталіна Георгіева. Яна прызнала, што сусветная супольнасць недаацаніла інфляцыю, з якой сутыкнулася глабальная эканоміка. «У кастрычніку мінулага года многія з нас былі вельмі аптымістычныя: рост быў устойлівы, вакцыны ўсялялі ў нас упэўненасць у тым, што пандэмія скончылася. На фоне гэтага мы думалі, што інфляцыя, якую перажываем, пройдзе. Аказалася, што мы памыляліся, — прызнала дырэктар МВФ. — Інфляцыя ўпартая. Гэта сведчыць аб неабходнасці таго, каб цэнтральныя банкі былі гэтак жа ўпартыя ў барацьбе з ёй». Як адзначаюць эксперты, з набліжэннем халадоў сітуацыя будзе яшчэ больш абвастрацца. Што ж чакае Еўропу?**

### На мяжы спынення

На еўрапейскім кантыненце папярэджанні аб надыходзе рэцэсіі зімой гучаць усё гучней, еўра прасядае, а энергетычны рынак ужо знаходзіцца ў стане крызісу. Але еўрапейскія ўрады ўсё яшчэ адстаюць на тры крокі ад развіцця падзей, заўважыла Bloomberg. Яны толькі канстатуюць факты і папярэджваюць аб тым, што надалей будзе яшчэ цяжэй. Так, прэм'ер-міністр Бельгіі Аляксандр дэ Кроа папярэдзіў, што еўрапейская эканоміка можа поўнасцю спыніцца, калі не будуць хутка прыняты меры для выхаду з энергетычнага крызісу, паведамляе агенцтва Bloomberg. «Некалькі такіх тыдняў, і еўрапейская эканоміка проста спыніцца», — заявіў Аляксандр дэ Кроа. Паводле слоў бельгійскага прэм'ера, асноўная рызыка для Еўропы — у дэіндустрыялізацыі і «фундаментальных сацыяльных хваляваннях».



Еўрапейскія краіны могуць сутыкнуцца з найбуйнейшым з моманту заканчэння Другой сусветнай вайны эканамічным крызісам. Аб гэтым папярэдзіў міністр прамысловасці і гандлю Чэхіі Ёзэф Сікела на пасяджэнні Савета ЕС па энергетыцы, паведаміла ТАСС. Прэм'ер-міністр Венгрыі Віктар Орбан заявіў, што энергетычны крызіс і высокі ўзровень інфляцыі ў ЕС, выкліканыя антырасійскімі санкцыямі, могуць паставіць Еўропу на калені. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што спробы заходніх краін аслабіць Расійскую Федэрацыю не мелі поспеху, нягледзячы на тое, што супраць РФ уведзена каля 11 тысяч (!) санкцый.

Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган заўважыў, што Еўропа сама вінаватая ў тым, што ў яе будзе складаная зіма ў сувязі са скарачэннем паставак газу з Расіі. «Еўропа пажынае тое, што пасеяла», — падкрэсліў турэцкі лідар. Па словах Эрдагана, цяперашняя сітуацыя выклікана пазіцыяй Еўропы ў дачыненні да Масквы, а таксама ўведзенымі антырасійскімі санкцыямі. «Еўропу чакае складаная зіма», — канстатаваў Эрдаган, дадаўшы пры гэтым, што ў самой Турцыі цяпер няма праблем з прыродным газам.

А вось у Еўропе стратэгічныя запасы блакітнага паліва могуць скончыцца да студзеня. Такое меркаванне выказаў генеральны дырэктар кампаніі GazDay Enerji Мехмет Доган. Намеснік старшыні Савета Бяспекі Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў лічыць, што з улікам росту цэн на газ у Еўропе да канца года тысяча кубаметраў блакітнага паліва можа каштаваць 5 тысяч еўра, паведаміла ТАСС.

Аглядальнік Forbes Кенэт Рапоза адзначыў у сваім матэрыяле, што Заходняя Еўропа ўвайшла ў доўгатэрміновы энергетычны крызіс і без расійскага газу коіцца ў Сярэднявечча, паведамляе РІА «Навіны». Як напісаў Рапоза, праблема высокай інфляцыі ў Еўропе суправаджаецца абмежаваннем у спажыванні энергарэсурсаў. З-за росту цэн на энерганосьбіты, жорсткіх мер Еўрапейскага цэнтральнага банка і падзення попыту Еўрасаюзу пагражае глыбокая і доўгая рэцэсія. Паводле прагнозаў фінансавага кангламерату Barclays Capital, яна працягнецца не менш чым да другога квартала 2023-га, а ВУП скароціцца на 1,7 працэнта.

### Зубы на паліцу

Фермеры і вытворцы харчовых тавараў у Еўропе папярэджваюць, што зімой можа ўзнікнуць сезонны дэфіцыт шырокага спектра прадуктаў харчавання пасярэднянага попыту. Акрамя таго, цэны на гэтыя тавары істотна вырастуць, адзначае брытанская газета Financial Times. Саюз Copa-Cogeca, які прадстаўляе інтарэсы фермераў Еўрасаюза, а таксама дзве буйныя асацыяцыі вытворцаў прадуктаў харчавання FoodDrink Europe і PFP паведамілі, што ўладальнікі фермерскіх гаспадарак пачалі памяншаць аб'ёмы прадукцыі. Адна з прычын такой сітуацыі — павышэнне расходаў на энергарэсурсы. «Чарговае павышэнне цэн на энерганосьбіты, асабліва на прыродны газ і электраэнергію, пагражае бесперапыннасці цыклаў вытворчасці аграхарчовых тавараў і, такім чынам, здольнасці і ў далейшым пастаўляць асноўныя сельскагаспадарчыя тавары, прадукты харчавання і кармавыя матэрыялы», — адзначаецца ў сумеснай заяве прадстаўнікоў галіны, з якой яны выступілі напярэдадні экстранная сустрэчы міністраў энергетыкі ЕС у Брусэлі.

Цэны на электраэнергію ў Еўропе імкліва ўзраслі сёлета на фоне зніжэння паставак расійскага прыроднага газу. Многія вытворцы апасаюцца, што зімой, калі попыт на электраэнергію павялічыцца, урады еўрапейскіх краін звернуцца да схем нармавання спажывання электрычнасці. Для харчовай галіны гэта стане вялізным ударам. Генеральны сакратар Copa-Cogeca Пека Песанен сказаў, што гэтай зімой еўрапейскія пакупнікі сутыкнуцца з яшчэ больш высокімі цэнамі і дэфіцытам садавіны і гародніны. «Такога мы раней не бачылі, — сказаў ён. — Ніхто не чакаў, што гэта адбудзецца і будзе мець такія маштабныя наступствы».

Калі справа датычыцца прадуктаў харчавання, электраэнергія патрэбная на ўсіх этапах: ад вытворчасці ўгнаенняў да збору ўраджаю і замарозкі прадукцыі. Паводле слоў Песанена, малочная і пякарная галіны пацярпелі ад росту цэн асабліва моцна, таму што пастэрызацыя і вытворчасць сухога малака — працэсы вельмі энергаёмістыя. Паводле даных Еўракамісіі, з пачатку года і да ліпеня цэны на сметанковае масла ў Еўрасаюзе выраслі на 80 працэнтаў, пры гэтым сухое малако падаражэла больш як на 50 працэнтаў, а ялавічына — на 28 працэнтаў. Але фермеры заўважаюць, што іх вытворчыя затраты растуць яшчэ хутчэй.

Многія вытворцы садавіны і агародніны ўжо скарачаюць пасадкі на наступны сезон, а некаторыя паведамляюць, што рост коштu эксплуатацыі цяпліц ужо перавышае той прыбытак, які яны змогуць атрымаць. Кампанія Nordic Greens, найбуйнейшы ў Швецыі вытворца памідораў, заявіла, што яна не будзе саджаць азімыя культуры, таму што не можа дазволіць сабе значныя выдаткі на электрычнасць.

Цяпліцы ў Нідэрландах (другі найбуйнейшы экспарцёр сельскагаспадарчай прадукцыі ў свеце пасля ЗША) таксама паступова зачыняюцца. «Верагодна, гэтай зімой ніхто не будзе вырошчваць памідоры і агуркі ў цяпліцах, таму што з фінансавага пункту гледжання гэта нявыгадна», — заявіў спецыяліст па энергазабеспячэнні ў галандскай кампаніі Glastuinbouw Nederland Аляксандр Формсма.

Сёлета ў Вялікабрытаніі ўраджай сельскагаспадарчых культур, якія вырошчваюцца ў ацяпляных цяпліцах, такіх як агуркі і перац, будзе напалову меншы за норму з-за высокіх цэн на электраэнергію. Лі Стайлз, сакратар Асацыяцыі вытворцаў Lea Valley ў Хартфардшыры, паведаміў, што вытворцы, якія звычайна збіралі ўраджай да кастрычніка ці нават лістапада, сёлета спыняюцца ўжо зараз, а пасадкі налета будуць залежаць ад вынікаў перагавораў аб цэнах з супермаркетамі. Тыя культуры, якія ўжо выраслі, будуць рэзка даражэць.

### Пагроза бунту

Гарачая ў палітычным плане восень і халодная, поўная нявызначанасці зіма — вось што чакае Еўропу найбліжэйшым часам з-за глупства і стратэгічнай недальнабачнасці яе палітычных эліт, заўважыла харвацкае выданне Geopolitika. Нявызначанасць — палітычная, эканамічная, энергетычная, сацыяльная і абаронная — усё больш скалынае Еўропу. Гэта датычыцца не толькі членаў Еўрасаюза, але і Вялікабрытаніі, якая пакінула супольнасць, а таксама тых краін, якія пакуль не ўвайшлі ў ЕС, адзначыла выданне.

Праблемы ў Еўропе ўсюды больш-менш аднолькавыя: высокая інфляцыя, нестабільнасць з пастаўкамі энергарэсурсаў, высокія цэны на паліва, электраэнергію, газ і прадукты, фінансавае знясіленне. Сюды ж варта дадаць імклівае падзенне ўзроўню жыцця еўрапейскіх грамадзян, перш за ўсё пенсіянераў, катаклізмы надвор'я, засухі, пажары. Нельга забываць і аб тым, што пандэмія каранавіруса можа вярнуцца, а разам з ёй урады еўрапейскіх краін зноў уводзяць абмежавальныя меры, якія з новай сілай ударацьь па эканоміцы і грамадстве.

З-за пералічанага ўсё больш краін Еўропы пачынаюць сутыкацца з палітычнымі крызісамі, піша Geopolitika. Так, у некаторых краінах (Балгарыі, Эстоніі, Вялікабрытаніі, Італіі) урады ўжо змяніліся. У шэрагу іншых дзяржаў дзейныя ўлады падвяргаюцца нарастаючаму ціску як з боку палітычнай апазіцыі, так і з боку сваіх грамадзян, людзі як ніколі заклапочаныя сваёй будучыняй. У такіх умовах многія прадстаўнікі апазіцыйных партый нават не імкнуцца сесці ў прэм'ерскія і міністэрскія крэслы. А для кіруючых структур на сёння пагроза бунту незадаволеных грамадзян стала значна больш небяспечнай, чым барацьба з палітычнымі сапернікамі.

Як заўважыў прадстаўнік расійскага МЗС Аляксей Драбінін, першапачаткова заходнія палітычныя дзеячы ўспрымаюцца як адукаваныя людзі, якія атрымлівалі адукацыю ў прэстыжных універсітэтах. Аднак на практыцы аказваецца, што ў ключавых еўрапейскіх дзяржавах палітычныя эліты дэградуюць, паведаміла ТАСС. У прыватнасці, Драбінін звярнуў увагу, што кіраўнікі МЗС некаторых краін ЕС блытаюцца ў геаграфічных назвах і дрэнна разбіраюцца ў гісторыі. Зіма неўзабаве пачнецца, для Еўропы халады — нібыта ледзяны душ. Як прагназуе Bloomberg, калі Старому Свету не ўдасца знайсці комплекснае рашэнне праблем для сваіх грамадзян, якія сутыкаюцца з фінансавымі цяжкасцямі, сацыяльныя наступствы будуць проста катастафічнымі.

**Захар БУРАК.**

### Даслоўна

## «Не дадзім змерзнуць!»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў аб гатоўнасці не даць змерзнуць Еўропе і дапамагчы ёй дровамі. Адпаведнае відэа распаўсюдзіў тэлеграм-канал «Пул Першага», паведаміла БелТА. Наім кіраўнік дзяржавы сячэ, мяркуючы па ўсім, адносна нядаўна прывезеныя дровы разам з Сяргеем Цяцерыным.

«Не дадзім, Сямёныч, Еўропе замерзнуць, дапаможам нашым братам. Можа, і яны нам дапамогуць», — заўважае Аляксандр Лукашэнка.

— Вы думаеце пра ўсіх. Аб Еўропе і аб усёй планеце, — кажа Сяргей Цяцерын.

— Ну а як? Мы ж цэнтр Еўропы, — адказвае Прэзідэнт.

Еўропе не выбіраць зараз: ёлка, бярозка, адзначае ён. «Галоўнае, каб цеплыня была. Трэба падумаць, як там, каб сяляне, рабочыя атрымалі, а не багацеі. І галоўнае, каб у Польшчы Дуда і Маравецкі не замерзлі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

— Гэта ж нашы суседзі, — падтрымаў яго бізнесмен.

— Можа, раздумаюцца, — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Відэа імгненна разышлося па сетках, мела шмат водгукаў. Карыстальнікі па праве ацанілі і пачуццё гумару Прэзідэнта, і выдатную фізічную форму, і гатоўнасць дапамагчы суседзям. «А вось умее! І робіць! Зайздросьце! Мы не прападзём!» — так гучыць адзін з каментарыяў. «Тут яшчэ дадатак да вобраза моцнага лідара, адэкватнага чалавека. Уяўляеце сабе Шольца, які сячэ дровы? А Макрона, занятага якой-небудзь фізічнай працай? Мне складана ўявіць, — заўважыў у эфіры тэлеканала СТБ беларускі палітолаг Аляксандр Шпакоўскі. — У дадзеным выпадку, мусіць, супрацьстаянне вобразаў. Гэта традыцыйны славянскі лідар, які заняты мужчынскай працай. Паглядзіце, Аляксандр Лукашэнка вельмі ўмела гэта робіць, шчыра скажам. Гэта тонкі тролінг заходнееўрапейскіх дзяржаў, суседніх дзяржаў, палякаў. Мы разумеем, адкуль сыходзіць асноўная пагроза ў адносінах да нашай краіны. Рашэнне па бязвізе ў Беларусі было асіметрычным адказам. Мы кажам: прыязджайце, дроў дадзім».

# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

## Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца

**Такога жаху — ні дагэтуль, ні пасля — не бачыла Беларусь. Напэўна, няма такога месца ў цэлым свеце, каб у АДЗІН дзень, у АДНЫМ месцы загінула столькі чалавек! Адна з найбольш маштабных трагедый Вялікай Айчыннай вайны адбылася 15 чэрвеня 1942 года на Магілёўшчыне. У агні, распаленым фашыстамі і іх памагатымі, загінула прыгожая вёска Боркі, што ў Кіраўскім раёне. Разам з вёскай зажыва згарэлі і яе жыхары. Жудасная смерць напаткала і насельніцтва навакольных пасёлкаў. Усе з іх, акрамя Борак, назаўжды былі сцёртыя з геаграфічнай карты: Доўгае Поле, Чырвоныя Араты, Хватаўка, Дзяржынскі, Пралетарскі, Закрынічча.**



**Мемарыяльны комплекс «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці» ў Борках. У чэрвені 2020 года ў яго адкрыцці ўдзельнічаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

### Трагедыю гэтай вёскі ў сваёй аповесці «Карнікі» апісаў Алесь Адамовіч

# ПЛАЧУЦЬ БОРКІ

1800 чалавек — жыхароў Борак і гэтых населеных пунктаў — загінула ў той дзень. Менавіта такая лічба была агучана адразу пасля вайны. Аднак, як вядома, многія дакументы доўгі час былі засакрэчаны, доступ у архівы быў абмежаваны. Не ўсё ў свой час расказалі і сведкі, некаторыя з якіх загаварылі толькі цяпер, калі пачалося расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. Сёння навукоўцы сцвярджаюць: у Борках і ў шасці найбліжэйшых да вёскі населеных пунктах загінула больш як дзве тысячы чалавек! Канкрэтная лічба — 2027 жыхароў — прыводзіцца і ў данясенні Дырлевангера аб карнай акцыі 15 чэрвеня 1942 года.

## Засада на лётчыкаў

Менавіта батальён Дырлевангера, аднаго з самых жорсткіх фашысцкіх злачынцаў, удзельнічаў у знішчэнні Борак і прылеглых населеных пунктаў. Дапамагалі яму рабіць чорную справу ўзвод калабарацыяністаў, 8-я айнзатцкаманда пад кіраўніцтвам штурмбанфюрэра СС Гейнца Рыхтэра, падраздзяленне рускай крымінальнай паліцыі з Магілёва, узвод 51-га рэзервовага паліцэйскага батальёна і аддзяленне Нацыянал-сацыялістычнага механізаванага корпуса, які з'яўляўся дапаможным фарміраваннем вермахта. Загад нямецкага кіраўніцтва — падвергнуць насельніцтва «спецыяльнай апрацоўцы» — быў выкананы.

У чым прычына, што супраць мірнага насельніцтва была накіравана такая колькасць нацыстаў? На думку краязнаўца Аляксандра Паўлюковіча, які не адзін дзень правёў у архівах, асабіста сустракаўся са сведкамі тых падзей, карнай аперацыі над нявіннымі людзьмі папярэднічалі падзеі, якія і паўплывалі на лёс жыхароў Борак і іншых населеных пунктаў. Расправіўшыся з мірным, безабаронным насельніцтвам — па сутнасці з дзецьмі, жанчынамі і старымі, — гітлераўцы і іх памагатыя адпомсцілі партызанам, якія напярэдадні забілі афіцэраў нямецкіх ваенна-паветраных сіл. Аднак аб усім па парадку.

На дарозе Магілёў — Бабруйск партызаны нярэдка арганізоўвалі засады на ворага. Баявыя дыверсіі здзяйснялі тут і народныя мсціўцы атрада Ігнація Ізоха. Гэта было боегатоўнае падраздзяленне з вопытам вядзення баёў і засад на дарогах.

— Дзякуючы агентурнай і вайсковай разведцы партызанам стала вядома, што ў Магілёве сканцэнтравана група карнікаў, яшчэ адна фарміруецца ў Кіраве, — расказвае **краязнаўца Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ.** — Па даных разведкі, акупанты перавозілі боепрыпасы, харчаванне, а таксама людзей да фронту. З мэтай паралізацыі жывой сілы і забеспячэння праціўніка камандзіру 2-й роты старшаму лейтэнанту Анцюху было загадана сфарміраваць аператыўную групу і выйсці ў раён шашы Магілёў — Бабруйск і старога Кацярынінскага тракту Магілёў — Бабруйск, арганізаваць засаду і знішчыць жывую сілу і транспарт праціўніка.

Задача была выканана. Партызаны знішчылі тры машыны і звыш 40 чалавек, большасць з якіх былі лётчыкамі. 42 афіцэры накіроўваліся ў Бабруйск за баявымі самалётамі. Яны павінны былі зверху знішчаць нашы гарады і сёлы, але партызаны не дапусцілі гэтага і ліквідавалі іх саміх. Праўда, народныя мсціўцы тады мала разумелі, якую вялізную шкоду нанеслі ворагу: лётчыкі — унікальныя спецыялісты, на падрыхтоўку якіх патрабуецца нямала часу і сродкаў. Пазбаўленне такіх каштоўных кадраў, несумненна, прывяло немцаў у шок.

Сярод партызан у той аперацыі пацярпелых не было. Усе яны вярнуліся ў атрад жывымі і здаровымі. Вынікі праведзенай дыверсіі задаволілі камандаванне. Акрамя знішчэння праціўніка, партызаны захапілі варожую зброю, боепрыпасы, прадукты харчавання — правіянтам для лётнага складу была загружана цэлая машына. Аляксандр Паўлюковіч, які вывучаў дакументы аб гэтай дыверсіі ў Нацыянальным архіве Беларусі, расказвае, што ў данясенні партызан сярод трафея ўказвалася толькі некалькі пісталетаў. «Атрымліваецца, што лётчыкі ехалі практычна бяззбройныя і без аховы», — адзначае ён. Аб тым, што немцы не аказвалі супраціўлення, у свой час сцвярджалі і сведкі.

Праз два дні пасля дыверсіі партызаны, зноў падчас засады на дарозе, знішчылі 27 эсэсаўцаў, у тым ліку восем СС-фюрараў. Аднак, нягледзячы на домыслы некаторых экспертаў наконт таго, што гэта стала апошняй кропляй, аб сувязі гібелі лётчыкаў і эсэсаўцаў са знішчэннем вёскі Боркі не ўказваецца ні ў адной крыніцы праціўніка. Да таго ж, нападзенні на нямецкія



**У 2004 годзе на месцы трагедыі ў вёсцы Боркі з'явілася капліца ў гонар іконы Божай Маці «Спагнанне загінулых».**

машыны і жывую сілу ворага ажыццяўляліся партызанамі ў гэтым раёне пастаянна. Аб гэтым сведчаць і нямецкія дакументы.

Гэта яшчэ раз пацвярджае, што абсалютна няправільна і памылкова звязваць жорсткасць фашыстаў да мірнага насельніцтва з дзеяннямі партызан. Палітыка нацыстаў на акупаванай тэрыторыі была жорсткая і адназначная: згодна з генеральным планам «Ост», 75 % беларусаў падлягала вынішчэнню. І гэтым усё сказана.

## Жорсткая расправа Дырлевангера

Раніцай 15 чэрвеня 1942 года жыхары вёскі Боркі спалі мірным сном. Тыя, хто рана прачынаўся, завіхаліся па гаспадарцы. Нічога не прадвяшчала бяды. Раптам карнікі акружылі вёску, навакольныя пасёлкі. Каб ніхто не ўцёк, устанавілі па перыметры кулямёты. Людзей забівалі ў іх жа хатах, не глядзелі, малы перад імі ці стары. Пасля хаты палілі — такім чынам спрабавалі схаваць сляды свайго злачынства.

Вось як яго самі дакументальна зафіксавалі немцы: ***«Учарашняя аперацыя супраць в. Боркі прайшла без судакранання з праціўнікам. Вёска адразу ж была акружана і занята. Жыхары, якія спрабавалі бегчы, былі расстраляныя, у тым ліку трое ўзброеных. Вобыск вёскі паказаў, што размова ідзе аб партызанскай вёсцы. Амаль нікога з мужчын у вёсцы не аказалася, вельмі мала коней і без вазоў. Падчас вобыску выяўлены сем рускіх вінтовак, тры ручныя гранаты, два пісталеты. Жыхары вёскі былі расстраляныя, вёска падпалена і згарэла...» (з данясення батальёна Дырлевангера ад 16 чэрвеня 1942 года).***

Знішчэнне Борак — не адзінае падобнае злачынства батальёна Дырлевангера. Гэтае нацысцкае падраздзяленне пакінула крывавы след на нашай зямлі. Ваеннаслужачыя батальёна, сфарміраванага з асуджаных браканьераў і забойцаў, а таксама калабарацыяністаў (батальён быў інтэрнацыянальным), удзельнічалі ў знішчэнні Хатыні, многіх іншых населеных пунктаў, праводзілі карныя акцыі супраць партызан. Дзе б ні з'яўляліся эсэсаўцы Дырлевангера, яны неслі смерць. Па жорсткасці і бесчалавечнасці іх цяжка было пераўзысці.

У пасёлку Закрынічча, што побач з Боркамі, гітлераўцы выгналі людзей на вуліцу. Пасля без разбору заганялі па восем чалавек у кожную хату, прымушалі класціся на падлогу. Па людзях пускалі аўтаматную чаргу. Скончыўшы злачынства ў адным доме, акупанты пераходзілі ў іншы. У іншых населеных пунктах, у тым ліку ў саміх Борках, фашысты заходзілі ў кожную хату і, нічога нікому не кажучы, стралялі ў людзей. Завяршыўшы расправу над мірнымі грамадзянамі, карнікі падпалілі ўсе сем населеных пунктаў.

## На папялішчы — сынавы косткі

Некаторым у тым пекле ўсё ж пашчасціла выжыць. У прыватнасці, жыхарцы спаленага пасёлка Закрынічча Еўфрасінні Сакадынец. Вось што яна ўспамінала аб тых трагічных падзеях: ***«15 чэрвеня 1942 года, раніцай, на золку, я пачула рух аўтамашын па шашы Магілёў — Бабруйск. У гэты час я выйшла з дому на двор і ўбачыла, што ад шашы ідуць аўтамашыны на наш пасёлак і пасёлак Боркі. Таксама заўважыла, што па полі ад шашы ланцугом ідуць карнікі і акружаюць нашу вёску, дакладней, наш пасёлак».***

Жанчына спалохалася, кінулася ў хату і залезла на печ. Яе трое дзяцей — 13-гадовы Валодзя, сямігадовы Мікалай і Рыгор (1940 года нараджэння) — спалі. У хаце таксама знаходзіўся чырвонаармеец, які апынуўся на акупаванай тэрыторыі і хаваўся ў пасёлку. Ён быў родам з Казані, звалі яго Васіль. ***«У хату зайшоў адзін немец, узброены аўтаматам, нешта сказаў па-нямецку і паказаў, каб выходзілі з дому, — успамінала сведка тых падзей. — Да гэтага часу мой сын Валодзя прачнуўся. На загад немца я, Васіль і сын Валодзя выйшлі з дому на вуліцу. Мае сыны Мікалай і Рыгор спалі, немец не дазволіў іх чапаць. Калі я выйшла на вуліцу, то ўбачыла, што карнікі выганяюць з усіх хат жыхароў пасёлка і збіраюць у адным месцы. Гэта было якраз супраць майго дома. Стоячы ў натоўпе сабраных грамадзян, я ўбачыла, як адзін карнік зайшоў у маю хату, а затым, выйшаўшы, спытаў па-руску, хто гаспадыня. Я назвалася. Ён загадаў забраць з сабой дзяцей, якія спалі. Я пайшла ў дом, разбудзіла сыноў і з імі прыйшла ў натоўп».***

Карнікі пачалі адбіраць па восем чалавек з натоўпу, заводзіць у дамы. Стрэлы, якія пачуліся, не пакінулі сумнення — людзей забіваюць. Старэйшы сын Еўфрасінні Сакадынец апынуўся ў першым доме... Праз некаторы час карнік пачаў ствалом зброі штурхаць у спіну і жанчыну (побач з ёй знаходзіліся яшчэ два сыны). ***«Гэта было недалёка ад майго дома, — успамінала пасля вайны Еўфрасіння Сакадынец. — У гэты момант я ўбачыла, што Казлоўскі Максім, ляснічы Маркевіч і Сакадынец Лявон, якіх заводзілі ў хату, пачалі ўцякаць. Ад мяне пабег мой сямігадовы сын Мікалай. Карнікі адкрылі па іх страляніну. Мой сын упаў на вуліцы, Маркевіч таксама ўпаў пад акном майго дома. Сакадынец Лявон таксама быў забіты, а Казлоўскаму, як я потым даведалася, удалося выратавацца. Скарыстаўшыся тым, што карнікі сталі пераследваць тых, хто ўцякаў, я з дзіцём на руках забегла ў свой дом. У гэты час да мяне ў хату прыбег пяцігадовы сын Казлоўскага Максім. Ён сказаў, што яго маці забілі, а бацька ўцёк. Я хутка падняла дошку падлогі і схавалася ў ямцы пад падлогай са сваім сынам і сынам Казлоўскага».***

Пасля яны чулі, як карнікі зайшлі ў хату і забілі сабаку, які знаходзіўся пад печчу. Чулі, як забіралі рэчы і... размаўлялі паміж сабою па-руску. Як раптам сын гаспадыні закашляў. Гітлераўцы зразумелі, у чым справа: паднялі дошку падлогі і пачалі страляць. Еўфрасіння Сакадынец была параненая ў левую нагу, яе сын — у грудзі. Сын Казлоўскага застаўся цэлы. Жанчына страціла прытомнасць...

Апрытомеўшы, Еўфрасіння вылезла з-пад падлогі (карнікаў паблізу чуваць не было) і выцягнула дзяцей. Уцячы ўдалося толькі ёй. Аднак застацца жывой, калі трое дзяцей загінулі, — такога лёсу не пажадаеш нават ворагу. Косткі аднаго з сыноў жанчына потым знайшла на пажарышчы ўласнай хаты...

## «Падняў коўдру і стрэліў дзяўчынцы ў галаву»

Наталля Ждановіч — адна з нямногіх, каму таксама пашчасціла выжыць, калі нацысты палілі Боркі і прылеглыя пасёлкі. Яе роднае Закрынічча карнікі акружылі на досвітку. Акрамя яе і маці, у хаце знаходзіліся сёстры дзяўчыны: Вольга (1928 г. нараджэння), Еўфрасіння (1925 г. нараджэння) і Ганна (1908 г. нараджэння) са сваімі дзецьмі — трынаццацігадовай Соняй, Рэмай, якой быў адзін год і восем месяцаў, і яшчэ адной дачкой, якая толькі нарадзілася, ёй яшчэ нават не паспелі даць імя.



**Жыхар в. Боркі Міхаіл САКАДЫНЕЦ — адзін з тых, каму ўдалося выжыць.**

Калі людзей вывелі ў цэнтр вёскі, а потым, падзяліўшы на групы, заводзілі ў хаты, яна трапіла ў сваю хату. ***«У нашым доме аказалася 20 чалавек разам з дзецьмі, — сведчыла пасля вайны жанчына. — Услед за намі ў хату зайшлі тры карнікі і спыніліся на парозе».*** Яны пачалі страляць па людзях. Наталлю параніла ў абедзве рукі. Калі нацысты сабраліся выходзіць, заплакала дачка сястры: дзяўчынка, якой быў адзін год і восем месяцаў, апынулася пад ложкам. Адзін з карнікаў падышоў да ложка, падняў коўдру і стрэліў дзяўчынцы ў галаву.

Карнікі пайшлі далей рабіць сваю чорную справу. ***«У доме чуўся стогн, бо некаторыя грамадзяне, якія знаходзіліся ў доме, былі толькі паранены, — расказвала Наталля Ждановіч. — Я прыўзняла галаву і спытала, хто жывы. З-пад ложка вылезла мая сяброўка Сакадынец Ніна Лявонаўна. Яна аказалася цэлай. Услед за ёй вылезла мая сястра Вольга, яна была параненая ў грудзі і жывот. У доме на трупе забітых ляжала сястра Еўфрасіння. Яна таксама аказалася параненай. Ёй куля трапіла ў лапатку, выйшла ў рот, выбіла два зубы і затрымалася ў сківіцы».***

Карнікі яшчэ некалькі разоў заходзілі — дабівалі тых, хто падаваў прыкметы жыцця. Неўзабаве пачалі прыносіць у хату сена — стала зразумела, чым усё скончыцца. Наталля і Ніна сабраліся бегчы: дзяўчаты вырашылі, што лепш загінуць ад кулі, чым згарэць жывымі. Калі яны выбраліся з-пад падлогі, у хаце ўжо гарэлі сцены. ***«Ніна і я выйшлі з дому і пабеглі полем у лес, узяўшыся за рукі, — згадвала дэталі таго дня Наталля Ждановіч. — Полем мы беглі каля кіламетра. Ці стралялі па нас карнікі, не памятаю. Уцякаючы, я паглядзела назад і ўбачыла, што ўсе пасёлкі нашай вёскі гарэлі. Прыбегшы на ўзлесак, я адчула боль у левай руцэ і даведалася, што паранена і ў левую руку. Я спрабавала сысці назад на поле, каб мяне забілі карнікі, але Ніна затрымала мяне...»***

Каля двух месяцаў дзяўчаты жылі ў вёсках, якія ўцалелі. Увосень 1943 гады Наталля і Ніна сышлі ў партызанскі атрад, дзе знаходзіліся да вызвалення раёна. З таго пекла ўдалося выбрацца яшчэ і сястры Наталлі Ждановіч. Праўда, раненні не далі ёй доўга пратрымацца: праз пяць тыдняў Еўфрасіння памерла ад заражэння крыві. Больш у жанчыны нікога не засталося: яе маці, сястра Вольга, сястра Ганна з трыма дзецьмі і брат, які жыў у Борках, былі спалены.

## Здарылася непапраўнае

Адным з тых, хто тым летнім днём выжыў у Борках, быў і Міхаіл Сакадынец. Сведка тых трагічных падзей толькі нядаўна пайшоў з жыцця, таму паспеў падзяліцца сваімі ўспамінамі.

У той чорны дзень на досвітку Міхаіл Сакадынец разам з братам пайшлі на возера паглядзець, ці трапіла ў сеткі, якія ўстанавілі напярэдадні, рыба. Адтуль і ўбачылі, як у бок вёскі едуць нямецкія машыны і матацыклы. Міша пабег дахаты, але доўга не затрымаўся. Маці з малодшым братам панесла сваякам малако. Следам за ёй з хаты выскачыў і Міша. Аднак не за імі, ён пайшоў да іншых сваякоў, якія жылі на суседняй вуліцы: Міша сябраваў з іх сынам Валодзем. Хлопцы вырашылі ісці да возера і схавацца ў купніку — малыя баяліся, што немцы разам з іншымі забяруць іх у Германію.






**Помнік, які з'явіўся на месцы трагедыі ў 1964 годзе. Яго адкрыццё было прымеркавана да 20-годдзя вызвалення Кіраўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Не ведалі яны, што карнікі падрыхтавалі яшчэ горшы лёс. На возера ўцячы не паспелі — каля брамкі ўжо стаялі два немцы.

Ужо стары, Міхаіл Скадынец прызнаваўся, што пазнаў бы іх нават праз столькі гадоў. Так яны ўрэзаліся ў памяць 14-гадовага хлопца. Немцы пералічылі ўсіх, хто знаходзіўся ў хаце, і пачалі страляць. ***«У нас з гаспадаром першых стрэлілі, — расказваў сведка. — Братаў пінжак быў надзеты на мне. Так я тым пінжаком закрыўся, адвярнуўся і зваліўся разам з гаспадаром з лаўкі. Гаспадару трапілі ў галаву. Усе мазгі і кроў, калі я ўпаў, трапілі мне на плячо».*** Гэта акурат і выратавала хлопчыка — карнікі падумалі, што забілі і яго.

Затаіўшы дыханне, Міша ляжаў і не рухаўся — прыкідваўся забітым. Напэўна, ад страху страціў прытомнасць, бо, калі апрытомеў, немцаў ужо не было. Усе, з кім яшчэ нядаўна знаходзіўся ў хаце, былі мёртвыя. Усе, акрамя яго. Шчаслівчык! Доўга не думаючы, падлетак кінуўся ў жыта і папоўз у хмызнякі. Адтуль — у лес. Там сустрэў Мацвеевіча з жонкай, таксама жыхароў Борак. Убачыўшы знаёмыя твары, пачаў плакаць. Толькі тады ўсвядоміў, што здарылася непапраўнае.

Разам з аднавяскоўцамі Міхаіл Сакадынец пераначаваў у суседнім Убалацці. Назаўтра вярнуліся ў Боркі. Ад некалі вялікай вёскі засталося адно папялішча. ***«Усё спалена, усё на свеце, — успамінаў ён. — Толькі ў школе-сямігодцы грубкі з цэглы стаялі, як помнікі ў Хатыні. Нават яшчэ свінні бегалі. Мы самыя крайнія жылі — наш дом быў каля могілак, там, дзе капліца зараз стаіць. Дома сястра Ганна была з двума дзецьмі. Я знайшоў толькі трупы дзяцей, а сястры не знайшоў».***

Таксама ў Міхаіла былі тры браты: Іван (1924 г. н.), Васіль (1920 г. н.) і Мікалай (1938 г. н.). Менавіта з ім, малодшым, і панесла маці сваякам малако. Дахаты не вярнуліся... Іван, які начаваў у суседа, знік бясследна. Абгарэлага Васіля Міша ўбачыў каля школы. Што здарылася з бацькам, хлопец задаваўся пытаннем доўгія тры месяцы. Якое ж шчасце было даведацца, што ён жывы!

Многія са сведак тых падзей у сваіх паказаннях сцвярджаюць: сярод карнікаў, якія палілі Боркі і прылеглыя населеныя пункты, былі людзі, якія размаўлялі па-руску, але з украінскім акцэнтам. Яшчэ сведкі, якія выжылі, расказвалі, што нацысты не шкадавалі нікога: нават мясцовых паліцэйскіх разам з іх сем'ямі спалілі.

***

Тыя жыхары Борак, якім пашчасціла выжыць, пабудавалі на папялішчы невялікія хаты. Аднак пажылі ў іх нядоўга. Боркі палілі тройчы. Два гады гэтыя няшчасныя людзі, якім удалося выжыць, туліліся ў лясах — да чэрвеня 1944 года, пакуль не прыйшла Чырвоная Армія.

Пасля вайны вёска Боркі адрадзілася. З'явіліся новыя хаты, пабудавалі школу. Нарадзіліся маленькія жыхары Борак. Аднак аб тых, хто жыў да іх і загінуў страшнай смерцю, тут ніколі не забываліся. На месцы трагедыі ўстанавілі помнік, узвялі капліцу ў гонар іконы Божай Маці «Спагнанне загінулых». Нядаўна ў Борках з'явіўся мемарыяльны комплекс «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці». Увекавечаны ў мемарыяле і знішчаныя разам з Боркамі населеныя пункты: Доўгае Поле, Чырвоны Араты, Хватаўка, Дзяржынскі, Пралетарскі, Закрынічча. Пасёлкі так і не паўсталі з попелу — іх не было каму адраджаць...

**Вераніка КАНЮТА,**
**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

## извещает о проведении 20.10.2022 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-52778 общей площадью 440,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 18. Назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: столовая. Составные части и принадлежности: литер X 1/к – пристройка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000001002170 площадью 19,0241 га (право постоянного пользования). *В отношении части капитального строения имеется действующий договор аренды*. **Начальная цена продажи – 311 040,00 бел. руб., задаток – 31 104,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-15550 общей площадью 470,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 18. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: К 1/к. Здание склада огнеопасных материалов. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000001002170 площадью 19,0241 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 230 688,00 бел. руб., задаток – 23 068,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3**. Капитальное строение с инвентарным номером 615/С-31811 общей площадью 396,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Минская, д. 71. Назначение: здание специализированное для бытового обслуживания населения; наименование: пошивочный цех. Составные части и принадлежности: мансардный этаж (литер А3/к), пристройка (литер 1), пристройка (литер 2). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003962 площадью 0,5566 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 33 004,80 бел. руб., задаток – 3 300,48 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Земельный участок с кадастровым номером 321081600009000030 площадью 0,0922 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Грабовский с/с, сад. тов-во «Ягодка», 45. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 668,82 бел. руб., задаток – 166,88 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Земельный участок с кадастровым номером 624487600006000010 площадью 0,0397 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Блужский с/с, СТ «Спадчина-88». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Спадчина-88». **Начальная цена продажи – 468,46 руб., задаток – 46,85 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Земельный участок с кадастровым номером 424385700001000060 площадью 0,1134 га (право собственности), расположенный по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Волковичский с/с, СТ «Берёзка», д. 11. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 270,08 бел. руб., задаток – 127,01 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 643/С-15914 общей площадью 3 407,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Любанский р-н, г. Любань, ул. Боровика, 58. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: ремонтная мастерская. Составные части и принадлежности: А1/кп – Ремонтная мастерская. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623450100001003249 площадью 1,5906 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 502 848,00 бел. руб., задаток – 50 284,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Объект недвижимого имущества в составе 1/3 доли капитального строения с инвентарным номером 632/С-1567 общей площадью 76,6 кв. м (назначение: здание блокированного жилого дома; наименование: жилой дом), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622081700101000006 площадью 0,2500 га (1/3 доли в праве пожизненного наследуемого владения) по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Воложинский с/с, д. Августово, 6. **Начальная цена продажи – 2 088,00 бел. руб., задаток – 208,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 610/D-42525 общей площадью 39,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 39, рынок строительных материалов, торговый ряд № 16, торговый павильон № 212. Назначение: торговое помещение; наименование: торговый павильон. **Начальная цена продажи – 12 960,00 бел. руб., задаток – 1 296,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10**. Изолированное помещение с инвентарным номером 610/D-10646 общей площадью 7,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 39, пом. 36. Назначение: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13, наименование: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13. **Начальная цена продажи – 1 173,65 бел. руб., задаток – 117,37 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Объект недвижимого имущества в составе:

капитальное строение с инвентарным номером 640/С-83761 общей площадью 810,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Гагарина, 48Г. Назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: здание солдатской столовой, инв. № 1003007. Составные части и принадлежности: здание солдатской столовой А1-2/к с пристройкой Б1/м, пристройкой 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001008881 площадью 0,4086 га (право аренды).

Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-93885 общей площадью 1010,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Гагарина, 48Г. Назначение: сооружение неустановленного назначения; наименование: элементы благоустройства, относящиеся к зданию солдатской столовой, инв. № 14/127. Составные части и принадлежности: покрытие асфальтобетонное 1.1, бордюр 1.2, ограждение 1.3, покрытие плитка 1.4. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001008881 площадью 0,4086 га (право аренды).

*Имеется запрещение отчуждения недвижимого имущества до выполнения условий договора купли-продажи.* **Начальная цена продажи – 175 564,80 бел. руб., задаток – 17 556,48 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25466 общей площадью 1 601,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 228/7. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: арочный гараж. Составные части и принадлежности: А1/м – арочный гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631 га (право аренды). *Является объектом ипотеки*. *В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 213 840,00 бел. руб., задаток – 21 384,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-39635 общей площадью 123,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 4А/1. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: пристройка АБК цеха малой механизации. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623850100003002652 площадью 0,8646 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 37 422,00 бел. руб., задаток – 3 742,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-11954 общей площадью 131,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 6/2. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: здание контрольно-пропускного пункта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000003000041 площадью 1,5907 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 134 136,00 бел. руб., задаток – 13 413,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15**. Земельный участок с кадастровым номером 724884000002000056 площадью 0,0997 га, расположенный по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Протасевичский с/с, СТ «Верейцы». Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства (право собственности). **Начальная цена продажи – 1 176,46 бел. руб., задаток – 117,65 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166725 общей площадью 196,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/2. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: административный корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 82 080,00 бел. руб., задаток – 8 208,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 17.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-57154 общей площадью 982,1 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 29А. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание склада. Составные части и принадлежности: одноэтажное панельно-кирпичное здание склада. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000007073439 площадью 0,2813 га (право постоянного пользования). *Является объектом ипотеки*. **Начальная цена продажи – 212 400,00 бел. руб., задаток – 21 240,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 18.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-57155 общей площадью 131,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 29А. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание склада. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание склада. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000007073440 площадью 0,2972 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 13 680,00 бел. руб., задаток – 1 368,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 19.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-114213 общей площадью 621,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 29А. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: столярный цех. Составные части и принадлежности: одноэтажное панельное основное строение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000007073440 площадью 0,2972 га (право постоянного пользования). *Является объектом ипотеки*. **Начальная цена продажи – 162 000,00 бел. руб., задаток – 16 200,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 20.** Изолированное помещение с инвентарным номером 614/D-17867 общей площадью 40,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода, ул. Машерова, д. 3, кв. 71. Назначение: квартира; наименование: квартира (*имеется самовольная перепланировка, незарегистрированная в установленном порядке; имеются зарегистрированные граждане*). **Начальная цена продажи – 36 000,00 бел. руб., задаток – 3 600,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 21.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708056821 общей площадью 82,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 138-309. Назначение: административно-торговое помещение; наименование: административно-торговое помещение. *Является объектом ипотеки.* **Начальная цена продажи – 207 360,00 бел. руб., задаток – 20 736,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 22.** Капитальное строение с инвентарным номером 620/С-36354 общей площадью 17,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 52/6. Назначение: здание специализированное коммунального хозяйства; наименование: вспомогательное здание котельной. Составные части и принадлежности: Б1/к-вспомогательное здание котельной. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622250100001000396 площадью 6,1566 га (право постоянного пользования). *В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 5 616,00 бел. руб., задаток – 561,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 23.** Капитальное строение с инвентарным номером 620/С-36355 общей площадью 118,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 52/1. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад вспомогательных и жидких материалов. Составные части и принадлежности: А1/бл-склад вспомогательных и жидких материалов, 1-пристройка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622250100001000396 площадью 6,1566 га (право постоянного пользования). *В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 47 844,00 бел. руб., задаток – 4 784,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 24.** Капитальное строение с инвентарным номером 341/С-7058 общей площадью 279,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Октябрьский р-н, г. п. Октябрьский, ул. Янки Купалы, д. 15. Назначение: здание специализированное розничной торговли; наименование: магазин № 4. Составные части и принадлежности: Б1/бл-пристройка, 1-сарай,2-сарай, а-площадка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 324055100001000133 площадью 0,1722 га (право постоянного пользования). *В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 262 440,00 бел. руб., задаток – 26 244,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 20.10.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 17.10.2022 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **20 октября 2022 года.**

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; + 375 17 266 63 02.**

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белэнергоснабкомплект» (Продавец)**

Аукцион состоится **29.09.2022** в **11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1: грузовой специальный автокран MAZ 5337**
**(с гидравлическим приводом КС-3577-4), кузов (рама) № 3390.**

Начальная цена с НДС – 9 360,00 руб. Задаток – 936,00 руб.

**Лот № 2: грузовой седельный тягач MAZ 5432A5-323,**
**кузов (рама) № Y3M5432A590000854, 2009 г. в.**

Начальная цена с НДС – 12 900,00 руб. Задаток – 1 290,00 руб.

**Лот № 3: полуприцеп бортовой тентовый MAZ 975800 - 2010,**
**кузов (рама) № Y3M97580090011866, 2009 г. в.**

Начальная цена с НДС – 7 140,00 руб. Задаток – 714,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–3:**
**г. Минск, 1-й пер. Монтажников, 8. Шаг аукциона – 5 %.**

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона, – **ino.by**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатков – **27.09.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МТЗ» (Продавец)**

Аукцион состоится **18.10.2022** в **11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1: станок токарно-карусельный, мод. 1А516МФ3,**
**инв. № 154136, год выпуска – 1986,**
**место нахождения: г. Минск, ул. Долгобродская, 29.**

Начальная цена с НДС – 113 160,00 руб.
Задаток – 11 316,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона, – **ino.by.**
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – **14.10.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

29.09.2022 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров – 20.09.2022 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 20.09.2022 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200050191

Наблюдательный совет.

---

**Объявление о проведении первых торгов в форме конкурса по продаже имущества**

**Бобруйское ОАО «Агромашсервис»**

Организатор торгов:
УПРАВЛЯЮЩИЙ ООО «УПРАВЛЯЮЩАЯ КОМПАНИЯ БРИК-СХ»
ДИРЕКТОР: ДЕНЕКИНА ЖАННА ВЛАДИМИРОВНА,
+ 375 29 154-55-36; 333014914@MAIL.RU

Продавец имущества:
БОБРУЙСКОЕ ОАО «АГРОМАШСЕРВИС»
УНП 700003471

Место проведения торгов:
**ул. Гоголя, дом 173 А, г. Бобруйск, Могилевская область.**

**Дата, время и форма проведения торгов**
Первые торги по продаже лота № 1 – в форме конкурса – **состоятся 17.10.2022 года в 17.00.**

Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по контактному телефону +375 (029) 154-55-36.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00 с предварительным согласованием с организатором торгов.

Лот № 1: комплекс имущества сельскохозяйственного назначения (объекты недвижимости, оборудование) стоимостью 254 802,54 белорусского рубля.

Вышеуказанные объекты (имущественные комплексы) находятся по адресу: Могилевская обл., Бобруйский район (около д. Думановщина, д. Слобода, д. Химы, д. Гончаровка).

Ознакомиться с предметами торгов можно по месту их нахождения с 09.00 до 17.00 в рабочие дни, предварительно согласовав время с организатором торгов по телефону +375 44 561-40-48 либо по запросу на электронную почту управляющего: 333014914@mail.ru.

**Начальная цена предмета торгов**
Лот № 1: 254 802,54 (двести пятьдесят четыре тысячи восемьсот два рубля, 54 копейки).

**Условия конкурса (для лотов № 1)**
Условия конкурса для имущественного комплекса № 1:
сохранение профиля деятельности предприятия и основного вида деятельности (сельское хозяйство). Сохранение целевого назначения продаваемых объектов – для целей производства сельскохозяйственной продукции.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




Старшыні Савета рэктараў даводзілася ўключацца ў рашэнне як стратэгічных, так і тактычных пытанняў функцыянавання і развіцця вышэйшай адукацыі. Уваходжанне Беларусі ў Балонскі працэс, двухузроўневасць вышэйшай адукацыі, прызначэнне магістратуры, стандартызацыя вышэйшай адукацыі, якаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу, адукацыйныя тэхналогіі, універсітэцкая навука, спецыялізацыя ВНУ, працаўладкаванне выпускнікоў, правілы прыёму, змястоўны бок і якасць школьнай адукацыі — гэтыя і многія іншыя пытанні зацікаўлена і дэталёва абмяркоўваліся ў Савеце рэктараў. Пры гэтым здараліся і напружанні. Напрыклад, па адкрыццю новых спецыяльнасцяў ці стварэнні ў рэгіёнах філіялаў універсітэтаў.

Шымаў, як у свой час і рэктар Кудрашоў, быў прыхільнікам канцэнтрацыі кадравага патэнцыялу і матэрыяльнай базы на профільных кафедрах, буйных факультэтах і ў спецыялізаваных ВНУ. Здавалася б, у нас невялікая краіна, і было б мэтазгодна рыхтаваць, напрыклад, спецыялістаў для перапрацоўчай прамысловасці ў адной ВНУ. У Савецкім Саюзе так і было. Падрыхтоўка спецыялістаў-тэхнолагаў для хлебнай прамысловасці, кансервавых заводаў, брадзільных вытворчасцяў ажыццяўлялася ў трох вызначаных дзеля гэтага ВНУ. Заходні рэгіён забяспечваў такімі кадрамі Магілёўскі тэхналагічны інстытут. Дарэчы, пры яго адкрыцці і прафесарска-выкладчыцкі склад збіралі па ўсім СССР. А ўжо пры фарміраванні нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі ў незалежнай Беларусі падрыхтоўку такіх спецыялістаў пажадалі адкрыць універсітэты ў кожным рэгіёне. Ні кадраў, ні матэрыяльнай базы, ні ўвогуле разумення складанасці рашэння гэтай задачы, але ўсё апраўдвалі попыт на такіх спецыялістаў. Рэктараў гэтых ВНУ актыўна падтрымлівалі губернатары. Яны ўвогуле мелі намер усё рабіць у сваім рэгіёне і раўніва сачылі ў гэтых пытаннях адзін за адным. Рашэнні па адкрыцці спецыяльнасцяў ва ўніверсітэтах прымала міністэрства, але Савет рэктараў на чале са старшынёю Шымавым у гэтым працэсе выступаў прафесійным бастыёнам, пераадолець які было няпроста.

Ці філіялы ўніверсітэтаў. Мы з Уладзімірам Мікалаевічам знайшлі хітрыкі расійскіх ВНУ прыватнай формы ўласнасці: абыходзячы Савет рэктараў і Міністэрства адукацыі праз наша МЗС, яны адчынялі ў Беларусі свае прадстаўніцтвы. Гэта не філіялы, такім чынам ВНУ іншых дзяржаў мелі права на прадстаўленне ў нашай краіне магчымасцяў атрымання ў іх на платнай аснове вышэйшай адукацыі, гэта значыць, маглі агітаваць маладых людзей на паступленне ў свае ўніверсітэты. Адукацыйны працэс у прадстаўніцтвах увогуле не прадугледжваўся. На практыцы ж усё было інакш. Прынцыповая праверка функцыянавання прадстаўніцтваў паказала поўную дыскрэдытацыю імі вышэйшай адукацыі. Напрыклад, у Оршы мы выявілі прадстаўніцтва, дзе як быццам навучалася пяць тысяч студэнтаў-завочнікаў. У арандаванай універсітэтам двухпакаёвай кватэры! І нават дыпломы выдавалі. У такіх прадстаўніцтваў і магутныя лобі былі. Нам з Шымавым, у прыватнасці, казалі, што ў Оршы тры турмы, вось зараз адзін універсітэт з'явіўся — і той мы зачыняем. Гэтую сітуацыю (яна ж міжнароднага ўзроўню) давялося дакладваць Прэзідэнту, сваімі сіламі мы яе нармалізаваць не маглі.

Непакоіла нас і неўтаймоўнае жаданне рэктараў адчыняць філіялы сваіх ВНУ ў буйных гарадах Беларусі. Напрыклад, прыязджае ў міністэрства рэктар Гродзенскага ўніверсітэта імя Я. Купалы прафесар Я. А. Роўба ўзгадніць адкрыццё ў Лідзе філіяла свайго ўніверсітэта. Пытаюся ў яго:

— Яўген Аляксеевіч, колькі ехаць з Гродна да Ліды?

— 40 хвілін. Але ў Лідзе ёсць наш каледж, на базе якога мы і жадаем зрабіць свой філіял. Там нават ёсць доктар навук!

— Адзін?

— Нашы выкладчыкі вахтавым метадам будуць забяспечваць там вучэбны працэс.

— А матэрыяльная база?

— Памяшканні ёсць, абсталяваннем падзелімся.

— Дык навошта распыляць сродкі? Лепей жа іх выкарыстоўваць для развіцця вучэбных і навуковых лабараторый у самім універсітэце, куды і будзе прыязджаць моладзь з Ліды і іншых гарадоў. Там і выкладчыкі працуюць у звыклым адукацыйным асяроддзі. Мы ж з вамі бачылі, як у Мінску яны бегаюць з адной прыватнай ВНУ ў другую. Хуценька нешта пачытаў і далей пабег. Такія ніколі не забяспечаць вартасны ўзровень вучэбнага працэсу.

Уладзімір Мікалаевіч цалкам падзяляў такі падыход да адкрыцця філіялаў. У яго і прадметны вопыт у гэтым пытанні быў: філіял эканамічнага ўніверсітэта ў Бабруйску сябе не апраўдаў, яго давялося закрываць. А гэты ж горад у два разы большы за Ліду.

Старшыня Савета рэктараў заўсёды быў членам калегіі Міністэрства адукацыі і тым самым непасрэдна ўдзельнічаў у кіраванні галіною. Вопыт Шымава як міністра эканомікі быў надзвычай важны пры падрыхтоўцы нарад з удзелам Прэзідэнта па актуальных пытаннях жыцця і развіцця сістэмы адукацыі. Выступаў на іх Уладзімір Мікалаевіч з дакладам ці адказваў на пытанні Прэзідэнта — яго пазіцыя была заўсёды зразумелай і абгрунтаванай. Цяжкімі для нас з ім былі такія нарады: і па падрыхтоўцы навуковых кадраў, і па бакалаўрыяце, і па цэнтралізаваным тэсціраванні, і па стратэгічных пытаннях развіцця вышэйшай школы. Прэзідэнт нарады з рэктарамі праводзіў часта і пытаў з нас строга. Адныімі з самых цяжкіх былі нарады па пераходзе школьнай адукацыі на дванаццацігадовы тэрмін навучання. Нам заставалася тры гады, каб завяршыць гэты пераход. І раптам, даволі нечакана нават для Міністэрства адукацыі, на ўсіх узроўнях — ад настаўнікаў да членаў урада — узніклі сумненні ў неабходнасці для нашай краіны гімназій, ліцэяў, профільнага навучання ў старшых класах, увогуле дванаццацігадовага навучання ў школе. Гэтыя сумненні і прапанову вярнуцца да адзінаццацігодкі і традыцыйнай савецкай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы далажылі Прэзідэнту. Аляксандр Рыгоравіч правёў некалькі нарад па гэтым пытанні: з урадам, з педагагічнай грамадскасцю, пашыраным і вузкім колам. Ён сам быў гранічна заклапочаны гэтай праблемай і ад нас патрабаваў аргументацыі сваіх падыходаў самым строгім чынам.

Савет рэктараў папярэдне адстойваў дванаццацігодку — школьная рэформа была першапачаткова даволі грунтоўна прадумана і прывязана да тэрмінаў і зместу навучання ў ВНУ. Ды і, як вучоныя, рэктары разумелі, што гэты эксперымент трэба давесці да завяршэння, а пасля ўжо ацэньваць яго вынікі. Але на нарадзе ў Прэзідэнта яны абаранаць пераўтварэнні ў сярэдняй школе не сталі, а некаторыя з іх нават падтрымалі пераход на адзінаццацігадовае навучанне. Пазіцыю міністэрства пра неабходнасць хоць бы давесці рэформу да завяршэння адкрыта падтрымаў старшыня Савета рэктараў — на ўсіх нарадах, у тым ліку ў Прэзідэнта вузкім колам, перад прыняццем канчатковага рашэння.

Калі коратка, то з пераходам на дванаццацігодку мы крыху паспяшаліся. Да гэтага была не падрыхтаваная ні педагагічная, ні грамадскасць увогуле, многія бакі задуманых пераўтварэнняў школьнага навучання не ўспрымаліся бацькамі: з шасці гадоў — у першы клас, у васямнаццаць гадоў — у дванаццаты, конкурсны адбор у гімназію і ліцэй. Настаўнікі неадназначна ставіліся да пераносу ў праграмы старшых класаў некаторых традыцыйных для ВНУ вучэбных тэм, разам з бацькамі абураліся складанымі вучэбнымі праграмамі і падручнікамі. Нават я як міністр дапусціў у гэтай сітуацыі пралік, не ўлічыў масавую псіхалогію. Гэта ж, па сутнасці, мы павялічвалі на год тэрмін навучання ў сярэдняй школе не зверху, а знізу. У школу дзеці павінны былі ісці не з сямі, як было ў адзінаццацігодцы, а з шасці гадоў, пачатковы клас нават называўся нулявым. Для дзяцей-шасцігодак першы год быў тым самым дзіцячым садком, толькі ў першай палове дня яны крыху сядзелі за партамі. Ці ў прыстасаваных для гэтага школьных класах, ці ў тым самым дзіцячым садку. Таму знешне заставалася адзінаццацігодка: нулявы клас і з першага па адзінаццаты. Але міністр фінансаў Мікалай Пятровіч Корбут мне заявіў:

— Радзькоў, ты разбярыся, нулявы клас — гэта дзіцячы садок ці школа? Па якіх нормах мне фінансаваць гэты год?

А мы ж усе былі захоплены пераходам на дванаццацігодку, лічылі, што і знешнія формы школьнай адукацыі павінны ёй адпавядаць. Таму я адказаў:

* Гэта першы школьны клас!

Заставаўся б нулявым, можа быць, і дванаццацігодка б утрымалася, знешне застаючыся адзінаццацігодкай.

У сваіх прапановах і ўчынках Шымаў заўсёды настойлівы! Напрыклад, ён быў вельмі занепакоены адтокам моладзі са сферы навуковай дзейнасці. Разумныя, здольныя выпускнікі ВНУ аддавалі перавагу бізнесу, вытворча-гаспадарчай дзейнасці, а заставацца на кафедры для выкладчыцкай дзейнасці, паступаць у аспірантуру, рыхтавацца да абароны кандыдацкую, а затым доктарскую дысертацыю не жадалі. У бізнес сыходзілі і масцітыя выкладчыкі, у рыначнай эканоміцы людзі станавіліся прагматычнымі. Савет рэктараў вырашыў хадайнічаць перад Прэзідэнтам аб матэрыяльнай падтрымцы выкладчыкаў універсітэтаў, прапануючы ўвесці стымуляцыйныя даплаты за вучоныя званні дацэнта і прафесара. Я таксама падтрымліваў гэтыя прапановы, паколькі для прысваення такіх званняў ВАК патрабаваў рэзультатаў навуковай дзейнасці саіскальнікаў — публікацыі артыкулаў, манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, кіраўніцтва аспірантамі. З гэтымі ідэямі Уладзімір Мікалаевіч пайшоў на даклад да Прэзідэнта.

Рашэнні Прэзідэнта я чакаў напружана. Мне як міністру нярэдка даводзілася абмяркоўваць з Аляксандрам Рыгоравічам падобныя пытанні. І гэта было няпроста! Напрыклад, дакладваю, што занепакоены невысокім заробкам маладых настаўнікаў. Настаўнікі са стажам ужо атрымліваюць да акладу надбаўкі за катэгорыю, за той самы стаж, дамагаюцца большай вучэбнай нагрузкі, а ў пачынаючых педагогаў гэтага няма. А ім трэба прыгожа апрануцца, схадзіць з сябрамі ў тэатр, у кафэ, купіць камп'ютар і новы тэлефон, плаціць за арэнду жылля. Прэзідэнт мне гаворыць:

— Ты мяне ў гэтым не пераконвай! Я сам пачынаў самастойнае жыццё настаўнікам гісторыі ў сельскай школе. Дадам да таго, што ты сказаў: у гэты час у іх ствараюцца сем'і, нараджаюцца дзеці. Канешне, маладых настаўнікаў трэба падтрымаць. Але дзе для гэтага ўзяць грошы? Зменшыць заробак настаўнікам са стажам?

— Не, Аляксандр Рыгоравіч, я гэтага не прапаноўваю. Іх заробак недасяжным не назавеш, ды і зменшаць заробак нельга ні пры якіх абставінах.

— Тады шукайце ва ўрадзе крыніцу фінансавання на гэтыя мэты. І надалей пры падрыхтоўцы такіх пытанняў трэба прапаноўваць і магчымыя варыянты іх вырашэння.

Шымаў пасля даклада Прэзідэнту прыехаў у міністэрства зіхатлівым:

— Прэзідэнт пагадзіўся з маімі довадамі па ўсталяванні надбавак дацэнтам і прафесарам!

Ведаючы, як вырашаюцца ў Прэзідэнта такія пытанні, насцярожана пытаюся:

— А што канкрэтна сказаў з гэтай нагоды Аляксандр Рыгоравіч?

— Перадайце міністру, няхай рыхтуе нараду па гэтым пытанні з маім удзелам.

— Дык ён жа запатрабуе вызначыць крыніцу фінансавання на гэтыя мэты!

— А гэта ўжо вашы, Аляксандр Міхайлавіч, пытанні. Вы ж міністр.

Канешне, і нараду мы рыхтавалі разам, і крыніцы фінансавання знайшлі. Нагадаю, што Шымаў прыйшоў у рэктары з пасады міністра эканомікі.

Ужо без мяне, але Уладзімір Мікалаевіч здолеў пераканаць Прэзідэнта і аб надбаўцы да пенсіі дактарам навук, прафесарам.

***Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.***

*(Працяг будзе.)*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня, 13, 20, 27 жніўня, 3 верасня.)*

# «ЗЫХОДЗІЦЬ СА СВАІХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ...»

## Інстытут гісторыі НАН выдаў зборнік прац аб Рыжскім міры 1921 года

**Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук прэзентаваў зборнік навуковых прац «Рыжскі мір 1921 года і Беларусь (да 100-годдзя заключэння)». Выданне выйшла ў свет да Дня народнага адзінства, перадае карэспандэнт БелТА.**




«Гэты зборнік стаў сімвалічнай падзеяй, паколькі мы гэтымі днямі адзначаем гадавіну аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Безумоўна, гэта знакавы момант, таму мы праводзім такое мерапрыемства, — сказаў **вучоны сакратар Інстытута гісторыі НАН Павел ТРУБЧЫК.** — Мы павінны даследаваць факты, абставіны не толькі заключэння Рыжскага мірнага дагавора, але і ў цэлым перыяду знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы. Ёсць вельмі шмат пытанняў. І гэтыя пытанні заўсёды выклікаюць значную цікавасць як з боку замежных навуковых работнікаў, даследчыкаў, так і грамадства».

Тэрытарыяльны аспект — асноўны ў пытанні нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва, падкрэсліў вучоны сакратар. «Мы многае можам сказаць пра нацыянальную мову, культуру. Але і тэрыторыя з'яўляецца адным з важнейшых крытэрыяў дзяржаўнага будаўніцтва. Без тых падзей, пра якія мы будзем гаварыць, пад вялікім пытаннем была б магчымасць існавання сучаснай Беларусі ў тых межах, якія мы ведаем на сённяшні дзень. Таму 17 верасня стала святочнай датай, на яе звяртаецца вялікая ўвага», — адзначыў Павел Трубчык.

Паводле яго слоў, ёсць і крытыкі такіх поглядаў. «Мы павінны зыходзіць са сваіх нацыянальных інтарэсаў. І калі мы не будзем даследаваць падзеі таго перыяду, не будзем на іх звяртаць увагі, то за нас гэта зробяць іншыя, і беларусы ў гэтых даследаваннях не будуць выступаць у якасці аб'екта вывучэння. Як гэта ўжо здарылася ў 1921 годзе, калі без уліку інтарэсаў беларускага боку было падпісана пагадненне, у адпаведнасці з якім значная частка Беларусі была ўключана ў склад польскай дзяржавы», — дадаў Павел Трубчык.

# «ПА СХОДЗЕ МНОГІХ ДЗЁН Я ЗНОЎ ЗІРНУЎ У ВОЧЫ РОДНЫМ ДОЛАМ...»

## Як беларускія пісьменнікі сустрэлі 17 верасня 1939 года

**ПАДЗЕЛ Беларусі на дзве часткі ў першай палове мінулага стагоддзя балюча закрануў кожнага тагачаснага беларускага пісьменніка... Закрануў і ўзрушыў кожнага і дзень вызвалення Заходняй Беларусі, аб'яднанне разарванай напалам краіны. Давайце ўспомнім, дзе былі вядомыя нашы літаратары ў той знакавы момант, як адгукнуліся на падзеі.**

### «Больш з табою ўжо ніколі я не разлучуся»

Янка Купала 17 верасня 1939 года знаходзіўся ў Ерэване, на VII пленуме праўлення ССП СССР, прысвечанага 1000-годдзю армянскага народнага эпасу «Давід Сасунскі». Там паэт і даведаўся пра вызваленне Заходняй Беларусі, там і напісаў свае першыя водгукі на гэтую тэму. У нумары «Звязды» ад 21 верасня 1939 года на першай паласе быў надрукаваны яго зварот пад назвай «Вітаю мудрае рашэнне ўрада», дасланы з Арменіі:



*«Беларуская культура ў панскай Польшчы была падаўлена, разгромлена. Народы Заходняй Беларусі жылі жабрацкім, галодным жыццём. Савецкі ўрад прыйшоў на дапамогу прыгнечаным народам... Я ад усяго сэрца вітаю рашэнне нашага роднага ўрада, які заўсёды выражае волю народа».*

У хуткім часе па вяртанні на радзіму Купала з іншымі беларускімі пісьменнікамі адпраўляецца ў Беласток, удзельнічае ў рабоце Народнага сходу Заходняй Беларусі, дзе будзе прынята адначасовае рашэнне аб з'яднанні ў адну дзяржаву.

*Ты з Заходняй,*
*я з Усходняй*
*Нашай Беларусі,*
*Больш з табою ўжо ніколі*
*Я не разлучуся.*

*Тваe коні, мае коні*
*Пасля дзён трывожных,*
*Будуць пасвіціся разам*
*На лугу мурожным.*

### «Больш дваццаці гадоў нас разлучала граніца»

Якуб Колас вестку аб вызваленні Заходняй Беларусі сустрэў у Мінску. Гэта была вялікая радасць, бо на тым баку мяжы засталіся родныя, сябры... Канстанцін Міхайлавіч нават не змог правесці ў апошні шлях сваю маці, якая памерла ў 1929 годзе, — паехаць на пахаванне было немагчыма.

19 верасня 1939 года на першай паласе «Звязды» была змешчана адозва Якуба Коласа «Браты Заходняй Беларусі»:



*«Я хачу, каб вы пачулі мой голас і словы мае, што ідуць ад чыстага сэрца.*

*Больш дваццаці гадоў нас разлучала граніца, рассекшы на дзве часткі жывое цела народа, яго зямлю.*

*Розныя дарогамі ішло наша жыццё па адзін і па другі бок граніцы...*

*Чатыры гады таму назад я ехаў праз Заходнюю Беларусь. З акна вагона бачыў я тыя мясціны, па якіх ужо даўно тысячы разоў хадзілі мае ногі. Пачуццё горычы сціскала маё сэрца, калі пазіраў я на вузенькія палоскі, на ўбогія хаты, на прыбітыя горам невясёлыя постаці сваіх братоў. Нярадасныя, даўно забытыя перажыванні паўставалі зноў. Я напісаў тады вам прысвячэнне «З дарогі», якое, быць можа, да вас і не дайшло.*

*«Па сходзе многіх дзён*
*Я зноў зірнуў*
*у вочы родным долам...*
*Зняменне, ціш і сон,*
*Убоства і прыгон,*
*За крыжам крыж,*
*астрогі ды касцёлы...*
*Дзе ж посулы паноў,*
*Іх лёкаяў аб роўнасці,*
*аб волі?*
*У дзвэнканні званоў,*
*У звоне кайданоў,*
*У свісце бізуноў,*
*У голадзе, асадніцтве,*
*падполлі...»*

*Браты! Адбыўся суд гісторыі. Жудасным акордам трывогі, слёз, пакуты, знішчэння і смерці канчаецца панскае панаванне. У бяздонне нязноснага гора ўвёў панскі ўрад сваю дзяржаву і народы, а сам збег ганебна. Ці маглі мы спакойна стаяць убаку і глядзець на вашу пакуту?»*

Пасля свайго ўдзелу ў Народным сходзе ў Беластоку Якуб Колас напіша ў лісце паэту і перакладчыку Сяргею Гарадзецкаму:

*«Потрясающее, глубоко волнующее впечатление произвело это собрание. Мне никогда еще не случалось видеть такой съезд, такой народный сход, где бы с такой силой изливалась душа народа, его горькая обида, нанесенная подлыми, глупыми, спесивыми угнетателями... Меня также глубоко взволновало и то обстоятельство, что белорусский народ не забыл и своих певцов, меня и Купалу, и выразил нам громко свою признательность».*

### «— Няма такой мовы! — Відаць, ёсць — калі гаворым...»

На фотаздымку групы палітвязняў Гродзенскай турмы, якіх вызваліла Чырвоная Армія ў верасні 1939 года, у першым радзе з правага боку, у ваенным фрэнчы, паўляжыць паэт Валянцін Таўлай. Гэты чалавек шмат адпакутваў дзеля таго, каб дзень уз'яднання Беларусі настаў. Згадаем хоць бы ўспаміны Таўлая пра часы яго навучання ў Слонімскай настаўніцкай семінарыі:



*«Настаўнік, нават не ўзнімаючы вачэй, задае шаблонныя пытанні...*

*— Нацыянальнасць? — пяро аўтаматычна выводзіць першыя літары.*

*— Беларуская.*

*Настаўнік глянуў на мяне... Вучні разяўляюцца ад здзіўлення. Я трымаюся свайго. Пяро злосна скрыпіць, запісваючы мой упарты адказ.*

*— Родная мова ў сям'і?*

*— Беларуская.*

*— Няма такой мовы!*

*— Відаць, ёсць — калі гаворым...*

*— Гэта мужыцкая гаворка, бескультурная трасянка, якую забываецца кожны культурны выхадзец з тутэйшых і пасля саромеецца нат прыпамінаць!*

*— Я не саромеюся.*

*І зноў ідзе доўгая, патэтычная «саната» ў прозе. Астаюся пры сваім. Злоснае пяро скончыла скрыпець. Пад грозным позіркам настаўніка сядаю, адчуваючы, што хоць бой скончыўся, але цяжкая артылерыя яшчэ загаворыць. Яна загаварыла вельмі хутка: праз дзень-другі мяне пазбавілі стыпендыі».*

Валянцін Таўлай заўсёды будзе непахісны ў сваёй барацьбе за незалежнасць беларускага народа. Вось як успамінае пра іх вызваленне з Гродзенскай турмы Міхаіл Мінкевіч:

*«З самай раніцы 18 верасня ля турэмнай брамы сталі збірацца рабочыя гродзенскіх фабрык і сялянe бліжэйшых вёсак. Неўзабаве з-за сцен данёсся шматгалосы кліч: «Свабоду палітвязням! Хай жыве Чырвоная Армія!» З вокнаў турмы — воклічы вязняў: «Няхай жыве свабода!». Неўзабаве затрашчалі турэмныя краты, і мы выйшлі на гродзенскія вуліцы. Што рабілася ў горадзе — цяжка зразумець. Улады ніякай не было, але ва ўсім адчувалася, што паны прыціхлі, пытаіліся і рыхтуюцца да расправы над камуністамі. Мы пачалі ўзбройвацца. Атрымаў вінтоўку і Валянцін Таўлай... Не паспелі мы агледзіцца і расставіць свае сілы, як на вуліцах Гродна пачалася страляніна. Выпаўзлі са сваіх нор паліцэйскія, чыноўнікі, афіцэры, асаднікі. З касцёлаў і цэркваў загаварылі кулямёты. Пачалася аблава, і к вечару нас зноў прывялі ў турму. Таўлая кінулі ў камеру толькі ў поўнач. Твар у яго быў акрываўлены... Назаўтра нас судзіў ваенна-палявы суд. Мы добра разумелі, што гэта азначае, і не чакалі літасці. Усе адчувалі, што сёння, а магчыма заўтра многім прыйдзецца развітацца з жыццём. Разумеў гэта і Валянцін. Але не вешаў галавы. Хадзячы па камеры, ён расказваў аб учарашніх падзеях і беспераcтанку курыў... У гэтыя хвіліны кожны паварот турэмнага ключа мог быць вырашальным... Пад вечар, 19 верасня, над горадам з'явіліся першыя савецкія самалёты. Яны раскідвалі лістоўкі. Пачалося вызваленне Гродна. Неўзабаве рабочыя з чырвонымі павязкамі на рукавах расчынілі перад намі дзверы камер: «Выходзьце, таварышы! Свабода!».*

Сястра паэта Ніна ўспамінала:

*«Пасля вызвалення з турмы ў Гродне Валянцін дабраўся да Ліды, прыйшоў да бацькі ў вечары, ціхенька пастукаў у акно... У доме бацькі Валянціна, Паўла Дзям'янавіча, у гэты час на першым паверсе кватараваўся нейкі юрыст, а сям'я жыла на мансардзе ў невялікім пакойчыку з кухняй. Так вось у акно гэтага пакойчыка і пастукаў Валянцін. Я потым усё думала, як ён мог пастукаць у акно на мансардзе. Але потым дадумалася: пад акном раслі вішні...»*

### «Гэта ўжо быў каляндар новага жыцця і іншы ўсход сонца»

Максім Танк сустрэў 17 верасня 1939 года ў роднай Пількаўшчыне. За плячыма былі і турэмнае зняволенне, і падпольная барацьба, і літаратурнае прызнанне... Год 1939-ы быў для паэта нялёгкі. Паэт запісваў у дзённіку: *«Прачытаў апошнія літаратурныя навінкі, якія прыслаў мне з Варшавы Янка. Усё больш пераконваюся, што для папулярызацыі таго ці іншага паэта, ці нават цэлай літаратуры, патрэбна адпаведная званіца. Званіца гэтая — дзяржаўнасць і тое месца на зямлі, якое займае народ і яго мова... А наш голас усё яшчэ не вырваўся нават на волю з падвалаў астрожных карцараў. Аб якім рэзанансе нашай творчасці сёння можа быць*



*гаворка!».*

А 17 верасня, якраз у дзень свайго нараджэння, Максім Танк занатоўвае:

*«Не знаю, з чаго нават пачынаць запісваць падзеі гэтага дня. Хіба — з усходу сонца, якое хоць і дакладна ўзышло па календары, але гэта ўжо быў каляндар новага жыцця і іншы ўсход сонца.*

*Раніцай прыехалі на веласіпедах слабадскія хлопцы, сярод якіх быў і Кірыл Карабейнік. Яны першыя пачулі па радыё і прывезлі мне гэту ашаламляльную радасную вестку, што Чырвоная Армія перайшла граніцу і ідзе вызваляць Заходнюю Беларусь. Цікава, сама ідэя вызвалення Заходняй Беларусі пры дапамозе нашых усходніх братоў не была новая. Толькі за дваццаць гадоў акупацыі, я сказаў бы, яна стала літаратурнай тэмай.*

*І калі запаветная мара здзейснілася, мы ёй не менш здзівіліся, як ажыццяўленню казкі.*

*Я пазычыў у Глінскіх веласіпед, і мы ўсёй кампаніяй паехалі ў Мядзел, дзе, чуваць, была ўжо Чырвоная Армія. І сапраўды, з Навасёлкаў мы ўбачылі нятоўп сялян, якія віталі байцоў, крычалі «ўра!», калі міма праходзілі машыны, танкі. Увесь гэты бясконцы патак людзей, не бачаны намі тэхнікі з шумам і грукатам пераможна плыў на захад. Мы спыніліся на ўзгорку паміж Новым і Старым Мядзелам, адкуль яшчэ больш велічная адкрывалася перад намі карціна. Некаторыя кавалерыйскія часці на хвіліну спыняліся каля млына і паілі ў Мястры сваіх коней, а байцы змывалі з твару дарожны пыл і стому.*

*Дык вось наша свабода! Толькі я нейкі непадрыхтаваны сустракаю яе. Прыйшла ў хату гэта госця, а я ад хвалявання не знаю, дзе яе пасадзіць, чым яе частаваць, з чаго пачаць гутарку. Мне прыгадаўся расказ маёй маці пра сустрэчу двух салдат-аднасяльчан, якія не бачыліся некалькі год. «Сядзяць, — кажа яна, — у нас на прызбе, скрабуць бульбу і моўчкі ўсміхаюцца, паглядаючы адзін на аднаго, не верачы ў сваё шчасце, што сустрэліся на цяжкіх і крывавых дарогах вайны».*

*Пад вечар хлопцы пайшлі па маёнтках разбройваць паноў. Арыштавалі сватkaўскіх паліцэйскіх. Толькі каменданту ўдалося некуды ўцячы. Паліцэйскія — Група і Жалязны, — якія часта ў нас рабілі вобыскі і ганялі па этапах нас у Паставы, сустрэўшыся са мной, перапалохаліся. Відаць, думалі, што мы ім наладзім самасуд за ўсе іх розныя судовыя справы, допыты ў пастарунку, пратаколы, штрафы... Але ніхто іх не чапаў. Перадалі, як палонных, у рукі чырвонаармейцаў. І я ўзброіўся асадніцкім браўнінгам. Вінтоўкі ўзялі хлопцы, якія пайшлі адбіраць зброю ў стральцоў, кракусаў і вузлянскіх асаднікаў».*

### «Эйфарыя юнацкай закаханасці»

Пісьменніку Уладзіміру Калесніку ў 1939-м было ўсяго 17 гадоў. Ён сустрэў вестку аб вызваленні Заходняй Беларусі з усёй юначай захопленасцю: *«Можа быць, мая эйфарыя была перабольшана ва ўспрыманні тых падзей, але мне прыемна згадаць, што мая эйфарыя юнацкай закаханасці супадала тады з той узнёсласцю, якая панавала вакол».*



Жыў Калеснік тады ў роднай вёсцы Сіняўская Слабада, над Нёманам, на ўскрайку Налібоцкай пушчы. У кнізе «Усё чалавечае» ён напіша:

*«Прыйшоў памятны верасень 1939 года. У нашу вёску прынёс ён радасць, азмрочаную жалобай. Вяртаючыся з Гродзенскай турмы, трапіў у небяспеку пад Скідзелем Андрэй Балабановіч. Узброены ў Гродне рабочымі, адважны камуніст прыняў бой з атрадам паліцы, быў смяротна паранены і памёр ужо ў савецкім вайсковым шпіталі. Паклалі ўзрушаныя землякі свайго любімца і заступніка на вечны спачын пад ліпамі на школьным пляцы, насупраць вясковага могільніка... На пахаванне ў той верасnёвы жалобны дзень сышлася ўся ваколіца... Расла ў вачах простых людзей цана ахвярнасці тых, хто набліжаў жаданы час уз'яднання народа».*

**Людміла ІВАНОВА.**

Постаці

# Клопат пра Паўлінку і фанфік ад Караткевіча

## Штрыхі да партрэта Максіма Танка праз лісты да яго

**«Прайсці праз вернасць» — вось якое выпрабаванне называў самым цяжкім Максім Танк... Ён застаўся верным — свайму пакліканню, свайму народу, сваёй мове. 17 верасня мы адзначаем 110-годдзе паэта. Цэлы тыдзень на радзіме паэта, на Мядзельшчыне, адбываліся мерапрыемствы «Дарогамі Максіма Танка» — тэматычныя выставы і конкурсы, Танкаўскія чытанні, ускладанні кветак...**

**Шмат іпастасяў паэту давялося на сябе прымераць: ад бясправўнага вязня польскай турмы да старшыні Вярхоўнага Савета БССР...**

**І, зразумела, свой вобраз Яўгена Іванавіча Скурко застаўся ў яго родных, сяброў, паплечнікаў, у тых, каму дапамагаў. Давайце паспрабуем уявіць, якім ён быў, пагартаўшы дакументы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.**

### «Каб пра нас сказалі: «Зямля Таполі»

У фондзе Максіма Танка захоўваецца шмат лістоў... «Лісты, лісты! Яны, як порах, ад сэрца іх далей трымай!» — папярэджваў Танк у 1956 годзе ў вершы «Адасланыя лісты». Але ж тым яны і каштоўныя, што захоўваюць водгулле часу, даносяць эмоцыі і пачуцці... 12 лістапада 1955 года да Максіма Танка, галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», адпраўляецца ліст з сяла Лесавічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці, ад маладога настаўніка мясцовай школы. У лінёўскім нумары часопіса аўтар ліста дэбютаваў вершам «Машэка»... А заraз, пасля Шостай рэспубліканскай нарады маладых пісьменнікаў, якая адбылася ў верасні, наважыўся напісаць жывому класіку. Звалі аўтара ліста Уладзімір Караткевіч.

*«Паважаны Яўгеній Іванавіч! Прабачце, што турбую і адбіраю дарагі час, але што яшчэ застаецца рабіць. Вы ўжо не злуйцеся, калі адарву Вас ад нейкай важлівай справы, а проста адкладзіце адказ да таго часу, калі будзе магчымасць — я і пачакаць магу.*

*Перад ад'ездам з нарады мне шмат хто казаў, каб я ў сябе не проста так сядзеў, а ўсё ж пасылаў нешта, і хоць як мне нязручна, але я вырашыў пасланць. Доўга капаўся, давялося шмат перарабляць, і толькі цяпер вырашыў, што яны хоць чалавечы выгляд набылі. Адабраў 11 вершаў, адзін верш у прозе і невялічкую паэмку. Высылаю ў двух канвертах. Можа, і знойдзеце тут нешта вартае, хоць наўрад...*

*Яўгеній Іванавіч, ведаеце, мне б дужа хацелася, каб нехта проста, як старэйшы друг, а не так, як у кансультацыі, без громкіх слоў, сказаў, па якому шляху трэба ісці, чаго пазбягаць і на што звяртаць увагу, што зараз самае патрэбнае».*

Аўтар ліста трохі прыбядняецца — у яго самога можна шмат чаму павучыцца: і погляд на гісторыю Беларусі, і тое, якой мусіць быць нацыянальная літаратура, у яго дакладны і непахісны.

Танк пачытаў вершы пачаткоўца, адказаў... 24 снежня адпраўляецца ліст з сяла Лесавічы:

*«Дзякую Вам за думкі і добрыя парады, якія на шмат што адкрылі мне вочы. Я вельмі рады, што хаця адзін верш Вам спадабаўся, але яны ўсё ж... не тое так як яго (як гаварыў пан Возны ў «Наталцы-Палтаўцы»)... Мне вельмі сорамна за шматлікія недасканалыя мае вершы, я зараз шмат працую і прашу Вас пра адное: дазвольце мне раз праз тры, калі напішу нешта, што замысліў, прыслаць Вам, каб паказаць свае першыя самастойныя крокі».*

Эпісталярная размова ад самага пачатку перарастае ў размову вучня і настаўніка. У лісце да Танка ад 20 чэрвеня 1956 года Караткевіч разважае на «не зусім звычайную тэму: самастойнае жыццё літаратурнага вобраза».

*«Ну вось, скажам, французы маюць свой літаратурны тып, які з найбольшай паўнатой змалёўвае ўсю нацыю, немцы і іспанцы — таксама. Можна сказаць «Зямля Уленшпігеля», можна сказаць «Зямля Гайаваты», або «Зямля апрантугага ў шкуру віцязя». Відавочна, што такі літаратурны тып лепш за ўсё адбівае асноўныя рысы нацыянальнага характару, сэрца народа, яго імкненні і нават дробныя, другарадныя рысы. І пісьменнік або паэт часцей за ўсё разгартае іх у вялікай эпапеі... Нават і ў узбекаў ёсць Насрэдын... А вось у нас гэтага няма. Назавіце мне тып, які ўсебакова адбіваў бы рысы лепшага нашага чалавека, яго талент, яго характар, яго барацьбу, які, так бы мовіць, нават часткова адбіваў бы гісторыю народа. Яго няма, але ён павінен з'явіцца, ён ужо ёсць, ён пачынае шлях».*

Караткевіч мае здагадку адносна героя — народнага генія, і датычыцца яна паэмы Максіма Танка «Люцыян Таполя», напісанай у 1946 годзе:

*«Гэта быў адзін з майстроў вялікіх,*
*Звалі яго Люцыян Таполя,*
*А па клічцы проста Багароб.*
*Гэта ён*
*Уздоўж Віллі і Нёмна*
*І па ўсіх шляхах і скрыжаваннях*
*Будаваў капліцы і крыжы,*
*Выразаў апосталаў, прарокаў,*
*Больш падобных да сялян смаргонскіх,*
*Да віленскіх лесарубаў, рыбакоў».*

Сюжэт — пра дзівоснага майстра, якому біскуп, угледзеўшы блюзнерства, забараніў дзесяць гадоў займацца творчасцю... Майстар ссівеў, змарнеў... Але ўрэшце адпомсціў біскупу праз сваё мастацтва. У невялікім творы гучаць тыя матывы і інтанацыі, якія сталі камертонам і для Караткевіча... Напэўна, для абодвух паэтам прачытвалася алюзія на лёсы рэпрэсіраваных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Караткевіч у захапленні:

*«Мне здаецца, што ў нас ёсць толькі адзін вобраз, прыдатны выканаць гэту ролю. Вы ўжо зразумелі, што гэта — Люцыян Таполя.*

*У дні, калі немагчыма было працаваць, я думаў над яго жывым ценем. Мне здаецца, што нават Вы самі не ведаеце, што Вы стварылі.*

*Цяпер ён без Вашага ведама пойдзе ў жыццё, пачне абрастаць біяграфіяй, і я не здзіўлюся, калі й надалей будзе жыць у літаратуры «можа, сто, а можа, болей год». Адзін ужо ёсць у фільме «Несцерка», толькі без меры бяднейшы. А ён будзе жыць самастойна.*

*Я думаў над яго лёсам. Гэта прывілей добра напісанага вобраза, тым, калі не хочаш з ім расставацца, думаеш над ім і прадоўжваеш яго жыццё, магчыма, на свой капыл — але ж гэта толькі для сябе...*

*Памятайце мае словы, гэты чалавек стане калі-небудзь героем вялікай эпапеі і хоць незавершанай застанецца Ваша маленькая паэмка, але гэта добра, ёй трэба расці, каб пра нас сказалі: «Зямля Таполі».*

І Караткевіч робіць нечаканае — стварае сапраўдны фанфік па паэме Максіма Танка «Люцыян Таполя». Прыдумвае крануальную і падрабязную гісторыю героя... Паводле яе, Люцыян паходзіў з сям'і паўстанцаў, якіх кляймілі так, што рабіліся недатыкальнымі, ніхто не меў права ім дапамагаць. Маленькі хлопчык застаўся адзін, яму кідаюць хлеб — але, пабачыўшы кляйно, адбіраюць... Нарэшце адзін майстар падабраў знясіленае дзіця... І выгадаваў з яго пераемніка. Фанфік варты арыгінала:

*«І галоўнае, што магло адвярнуць ад канонаў, гэта старое мастацтва касцёла: «Stat magni nominis umbra» (так мінае слава свету) на сувоі ля ног хімеры над уваходам, вузкія вокны, цемра, драўляныя фігуры з рукамі як лазіны, худыя, белыя, выцягнутыя, як парасткі бульбы ў падпамосцы, страшны твар св. Себасцьяна над галавой. У цемры блукаюць цені, здаецца, што постаці рухаюцца. Цішыня (арган яшчэ не грае), і ў ёй чутны нечыя ўсхліпванні.*

*І раптам дзіцячы крык: а-а-а!»*

Караткевіч сцвярджае:

*«Не ведаю, ці любіце вы гэты свой верш і які любіце больш за ўсё? Яго трэба вельмі любіць і не верыць розным чугунным мазгам, якія кажуць, што гэта не самае важлівае».*

У лісце ад 8 жніўня 1956 года Караткевіч ужо выступае ў ролі суровага крытыка, што сведчыць: Максім Танк не займаў позу гуру:

*«Чытаў Вашыя вершы ў чацвёртым і шостым нумарах «Полымя». У чацвёртым — горш, чым заўсёды, а ў шостым вельмі добрыя».*

І менавіта да Максіма Танка звяртаецца Уладзімір Караткевіч, калі яму патрэбны быў водгук дзеля ўступлення ў Саюз пісьменнікаў.

### «Да слёз узрушыла мяне Ваша добразычлівасць»

Ёсць у архіве і лісты да Максіма Танка Паўліны Мядзёлкі. Лёс Паўлінкі, якая калісь натхняла Янку Купалу, але адпрэчыла ягонае каханне, выдаўся нялёгкі. Як і Максіму Танку, ёй давялося пацярпець за беларускую дзейнасць у панскай Польшчы, паспытаць турмы. Да Максіма Танка звярнулася, калі пачаліся праблемы з выданнем яе аўтабіяграфічнай кнігі.

*«Вы, мабыць, ужо ведаеце, што мая кніга «Сцежкамі жыцця», зацверджаная ў плане выдання на 1965 год, знята з плана дзякуючы пазаштатнаму рэдактару Т. Шараховскаму».*

Мядзёлка скардзіцца, што рукапіс скалечаны, выкраслены цэлыя раздзелы, напрыклад, пра Магдалену Радзівіл. А ўрэшце Шараховскі ўвогуле адмовіўся працаваць з крамольным рукапісам, даў «забойчую рэцэнзію ў духу 30-х гадоў», адзначыўшы сярод заган «тэндэнцыю высмейвання Янкі Купалы і Цёткі», згадкі пра людзей «буржуазна-нацыяналістычнага кірунку».

«Сцежкамі жыцця» пабачыла свет толькі ў 1974 годзе. Але Танк дапамагаў чым мог. У лісце ад 17 студзеня 1966 года Мядзёлка піша:

*«Дарагі Яўгеній Іванавіч! Учора атрымала ад Марыі Канстанцінаўны ліст, у якім яна, спасылаючыся на Вашу размову з ёй па тэлефоне, піша, каб я падала заяву ў Вярхоўны Савет з просьбай матэрыяльнай дапамогі мне. Да слёз узрушыла мяне Ваша добразычлівасць, Вашы чулыя адносіны да мяне. Я так ужо звыклася з тым, што на сваёй радзіме з пэўнага часу мяне больш кляваlі, чымся гладзілі, што такая ўвага да маёй сціплай асобы, як на абмеркаванні рамана У. Караткевіча ў Акадэміі навук, як таварышаў з краязнаўчага музея ў Маладзечне і нарэшце Ваша — так глыбока хвалюе, што і сну пазбаўляе».*

А вось ліст ад 4 лютага 1968-га:

*«Глыбокапаважаны, дарагі Яўгеній Іванавіч! Не знаходжу слоў гарачай падзякі за памяць і клапатлівасць аба мне... Учора атрымала 98 рб. па маёй заяве. Толькі балюча адчуваць, што з прычыны свайго недамагання я нічым цяпер не магу адплаціць дзяржаве і народу... Сардэчнае прывітанне прашу Вам перадаць Зося Сяргееўна Шамардзіна. Яна вельмі хацела б дастаць хоць невялікі зборнічак Вашых вершаў на беларускай мове, але і я не змагла для яе знайсці ў Мінску Вашых вершаў на беларускай мове».*

Тут згадваецца цікавая персона — сяброўка Паўліны Мядзёлкі Соф'я Шамардзіна, адна з заснавальніц беларускага жаночага руху, якая нейкі час была старэйшынай Галоўпалітасветы БССР. Дзякуючы ёй трапілі на сцэну «Тутэйшыя» Янкі Купалы. Яе кахаў Уладзімір Маякоўскі, яна была жонкай беларускага наркама Язэпа Адамовіча... Шамардзіну рэпрэсіравалі ўслед за мужам, яна прайшла сібірскія лагеры. У лісце ад 9 кастрычніка 1969 года Мядзёлка зноў яе згадвае:

*«Зофія Сяргееўна прапануе суправаджаць яе ў паездцы ў Мінск. Хоча паглядзець на паўстаўшую з руін нашу сталіцу, пабываць у нашых тэатрах, сустрэцца з Вамі. Толькі хацелі б застаць Вас у Мінску. А тым часам будзем чакаць Вас у Маскве».*

Галасы былых гадоў гучаць з пажаўцелых старонак лістоў.

*«Шмат слоў, якія не астылі*
*Ні ад дажджоў, ні ад снягоў*
*І не згубілі даўняй сілы,*
*І першага агню свайго»,* — рэфлексаваў Максім Танк.

А мы можам перачытваць тыя аркушыкі і ўзнаўляць ва ўяўленні вобраз аўтара «Люцыяна Таполі».

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**



# Спалучэнне класікі і сучаснасці

**У новым 85-м сезоне выдатную магчымасць кожнаму прадставіць Беларуская дзяржаўная філармонія. Таму што ў планах яе кіраўніцтва і творчых калектываў радаваць публіку новымі прачытаннямі музычнага мастацтва ў самых разнастайных канцэртных праграмах.**

— Нядаўна мне давялося пабываць на прэзентацыі кнігі «Беларуская эстрада ХХ стагоддзя». Так склалася, што і філармонія была спачатку найбольш эстраднай. Але ў ХХІ стагоддзі бачым змяненні ў запытах нашых гледачоў. Так, мы дакладна адчулі запыт на класічную акадэмічную музыку. Сёння выйграе той, каму ўдаецца спалучаць у сваёй рабоце традыцыю і сучаснасць, — адзначыў **генеральны дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр НІКІТА.** — Мы адчуваем дух часу, ставімся з вялікай павагай да нашага гледача, бо працуем перш за ўсё для яго. У 85-м канцэртным сезоне мы зробім усё магчымае, каб нашы канцэрты былі максімальна даступныя. А гэта становіцца магчымым тады, калі ёсць падтрымка ўстановы, што датычыцца арэнднай аплаты, камунальных паслуг, калі існуюць грантавыя субсідыі калектывам на стварэнне канцэртных праграм, і гэтак далей. У суседніх дзяржавах ёсць спецыяльныя праграмы, якія дазваляюць артыстам сусветнага ўзроўню прыязджаць да нас у рамках творчых абменаў. Такім чынам сёння наша філармонія, з'яўляючыся ўдзельнікам канцэртнай плеяды творчых арганізацый, мае магчымасць і ездзіць на гастролі, і прымаць у сябе адметных прафесіяналаў. Білеты на праграмы калектыву Аляксандра Анісімава прадаюцца за тыдзень.

Свой 85-ы дзень нараджэння філармонія адзначыць шэрагам адметных праграм і падзей. Адкрылі сезон канцэртам Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь (яму сёлета — 95 гадоў), а 8 кастрычніка калектыў запрашае на праграму, прысвечаную 75-годдзю свайго кіраўніка — маэстра Аляксандра Анісімава. У праграме вечара запланаваны творы Баха, Шастаковіча, а, напрыклад, у другой частцы ўладальніца пачэсных узнагарод Расійскай нацыянальнай прэміі і фестывалю «Залатая маска» Ірына Крыкунова выканае фінальную сцэну з оперы «Саламея» Штрауса.

Да Міжнароднага дня музыкі, 1 кастрычніка, Дзяржаўны камерны аркестр Рэспублікі Беларусь прадставіць новую праграму «Музычны буквар ад «До» да «Сі» ў рамках любімага публікай абанемента для ўсёй сям'і «Класіка — гэта класна!». Працягам стануць праграмы «Вандроўка вакол свету за 80 хвілін» і «Гумар у музыцы» ўжо пасля новага года.

Не абмінуць увагай у філармоніі і святкаванне 140-годдзя класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа і Янкі Купалы. 3 лістапада ўвазе публікі будзе прадстаўлены канцэрт «Мой родны кут» — сумесны праект Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Жыновіча і Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь, дзе прагучаць творы Ігара Лучанка, Аляксея Туранкова, Алега Моўчана і іншых. А 23 верасня аркестр імя Жыновіча дасць канцэрт «Мне не забыць той песні», прысвечаны памяці саліста «Песняроў» Леаніда Барткевіча.

**Алена ДРАПКО.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

проводит **20 октября 2022 года в 11.00** открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактный телефон: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена. К отчуждению предлагается:

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-72602, площадью 108,00 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – бытовое помещение, составные части и принадлежности – отапливаемая пристройка, благоустройство территории, асфальтобетонное покрытие, ограждение железобетонное, ворота цельнатные, калитка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4239, площадью 644,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – гараж с котельной, составные части и принадлежности – две пристройки, холодная пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4244, площадью – 497,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – гаражи № 2, составные части и принадлежности – пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г Бобруйск, ул. Бахарова, 274А;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4271, площадью 19,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – автозаправочная станция, составные части и принадлежности – насыпь для емкостей, мощение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4238, площадью 60,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – здание стоянки дорожной техники, составные части и принадлежности – навес, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4269, площадью 11,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – здание КНС, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002891 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А.

Имущество по частям не продается.

Суммарная начальная стоимость имущества – **316 400,00 белорусских рублей без учета НДС.**

Информация о земельном участке. Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках с кадастровыми номерами:

- 741000000007000161, площадью 1,1195 га, находящемся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3»;

- 741000000007002891, площадью 0,004 га, находящемся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3».

4. Дата, время и место проведения аукциона: **20.10.2022 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 14.10.2022; время: 17.00. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. На участие в аукционе к заявлению прилагаются:

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;

- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победителя аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

9. Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

10. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

11. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже вышеназванного имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» и на сайте ОАО «ДСТ № 3».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

проводит **20 октября 2022 года в 11.30** открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактный телефон: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена. К отчуждению предлагается:

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4270, площадью 23,0 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – технологическая площадка (КПП), составные части и принадлежности – площадка, забор, расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 741000000007002892 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А.

Суммарная начальная стоимость имущества – **61600,00 белорусских рублей без учета НДС.**

3. Информация о земельном участке. Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельном участке с кадастровым номером: 741000000007002892, площадью 0,3955 га, находящемся в срочном возмездном владении и пользовании (договор аренды земельного участка № 107 от 12.09.2019).

4. Дата, время и место проведения аукциона: **20.10.2022 в 11.30** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 14.10.2022; время: 17.00. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО "ДСТ № 3" соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

На участие в аукционе к заявлению прилагаются:

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;

- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победителя аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

9. Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

10. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

11. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже вышеназванного имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» и на сайте ОАО «ДСТ № 3».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

проводит **20 октября 2022 года в 12.00** открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактный телефон: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена.

К отчуждению предлагается:

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4236, площадью 657,3 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное наименование – административно-бытовой корпус, составные части и принадлежности – отапливаемая пристройка, благоустройство территории, асфальтобетонное покрытие ограждение металлическое, ограждение железобетонное, расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 741000000007002893, 741000000007002894 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278.

Суммарная начальная стоимость имущества – **195 000,00 белорусских рублей без учета НДС.**

3. Информация о земельном участке. Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках с кадастровыми номерами:

- 741000000007002893, площадью 0,2401 га, находящемся в срочном возмездном владении и пользовании (договор аренды земельного участка № 108 от 12.09.2019);

- 741000000007002894, площадью 0,0465 га, находящемся в срочном возмездном владении и пользовании (договор аренды земельного участка № 107 от 12.09.2019).

4. Дата, время и место проведения аукциона: **20.10.2022 в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 14.10.2022; время: 17.00. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. На участие в аукционе к заявлению прилагаются:
- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;

- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победителя аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

